ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

НЯДЗЕЛЯ, 30 КАСТРЫЧНІКА 1938 г. № 60 (402) ЦАНА 20 КАП.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

БОЛЬШЭВІЦКАЕ ПРЫВІТАННЕ ЛЕНІНСКА-СТАЛІНСКАМУ КАМСАМОЛУ У ДЗЕНЬ ЯГО СЛАЎНАГА ДВАЦЦАЦІГОДДЗЯ!

СЛАЎНЫ ЮБІЛЕЙ

29 кастрычніка 1938 года споўнілася дваццаць год ленінска-сталінскаму комуністычнаму саюзу моладзі.

Комсамол — масавая беспартыйная арганізацыя моладзі—выхаваи і выпеставан большэвіцкай партыяй, яе вялікімі правадырамі—Леніным і Сталіным. За дваццаць слаўных год комсамол вырас у шматмільённую арганізацыю і з'яўляецца верным памочнікам большэвіцкай партыі.

Вялікая Кастрычніцкая социялістычная рэволюцыя стварыла для працоўнай моладзі ўсяго свету маяк, які асвятляе ёй дарогу да поўнапраўнага, свабоднага і шчаслівага жыцця.

Першы з'езд Расійскага комуністычнага саюза моладзі, які адбыўся 29 кастрычніка 1918 года, завяршыў вялікую палосу збірання і згуртавання вакол комуністычнай партыі большэвікоў шматлікіх комуністычных аб'яднанняў моладзі, народжаных Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыяй.

Комсамол узрошчан большэвіцкай партыяй, яго гісторыя непарыўна звязана з гісторыяй барацьбы рабочага класа і сялянства пад кіраўніцтвам партыі за перамогу соцыялізма. На ўсіх этапах гэтай гераічнай барацьбы комсамол выступаў і выступае як верны памочнік партыі Леніна—Сталіна, як актыўны ўдзельнік слаўных баёў за савецкую ўладу і перамогу соцыялістычнага будаўніцтва.

«Комсамол заўсёды ішоў у першых радах нашых байцоў. Будзем спадзявацца, што комсамол будзе стаяць і ў далейшым у першых радах, высока несці наперад сцяг соцыялізма» (Сталін).

У годы грамадзянскай вайны комсамол правёў некалькі мабілізацый, ён пасылаў у Чырвоную Армію лепшых сваіх сыноў. Беззаветнай адданасцю справе соцыялізма, адвагай і мужнасцю комсамольцы-байцы заваявалі комсамолу нязвянучую славу.

З велізарным энтузіязмам ішла рэволюцыйная рабочая і сялянская моладзь абараняць заваёвы Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. У жорсткіх баях з белагвардзейцамі і інтэрвентамі комсамольцы, рабочая і сялянская моладзь праявілі велізарнейшую рэволюцыйную мужнасць і выключны гераізм. Баявой славай пакрылі сябе комсамольцы ў баях супроць усіх ворагаў соцыялістычнай радзімы.

Вобразы комсамольцаў-герояў грамадзянскай вайны ўвекавечаны ў літаратуры і мастацтве. Паўлюк Карчагін—герой аповесці «Як гартавалася сталь» пісьменніка-комсамольца орлэнаносца Нікалая Астроўскага—праўдзіва ўвасабляе характэрныя рысы перадавой рабочай моладзі гэтай эпохі.

Савецкі ўрад адзначыў выдатную ролю комсамола ў грамадзянскай вайне і ўзнагародзіў яго ордэнам Чырвонага Сцяга.

Натхнёны ўказаннямі Леніна на III з'ездзе РКСМ, комсамол пасля ліквідацыі франтоў грамадзянскай вайны, у годы аднаўлення і соцыялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі праявіў палкі энтузіязм, з'явіўся застрэльшчыкам соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, якое перарасло ў магутны стаханаўскі рух. Комсамол павёў моладзь у паход за авалоданне навукай і тэхнікай і зараз яго гераізм набыў сусветную славу. Усім вядомы імёны дэпутатаў-комсамольцаў тт. Каманіна, Крываноса, Навіцкага, Ангелінай, Фёдарава і інш.

Комсамол і ўся савецкая моладзь будавалі новыя гарады і заводы, домны і чыгункі, соўгасы і калгасы. Яны асвойвалі суровую далёкаўсходнюю тайгу і ледзяныя прасторы Арктыкі, загараджвалі шляхі рэк і азеляняли пустэчы. Велізарную дапамогу аказаў комсамол партыі Леніна—Сталіна ў калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

Комсамол і працоўная моладзь БССР авалодвае багацейшай культурай вялікага рускага народа і сусветнай культурай, каб рухаць наперад па шляху соцыялістычнага рэалізма літаратуру і мастацтва сваёй радзімы. Растуць таленавітыя кадры рабоча-сялянскай моладзі, прадстаўнікі якой займаюць ганаровае месца ў літаратуры і мастацтве Савецкай Беларусі.

З вялікім захапленнем аддае наша моладзь свой свабодны час мастацтву. Праходзячая ўсебеларуская алімпіяда паказала вялікі рост мастацкай самадзейнасці моладзі. У мастацкіх гуртках і студыях, на прадпрыемствах, у соўгасах і калгасах, у клубах растуць маладыя кадры майстроў — спевакоў, танцораў, жывапісцаў, скульптараў.

Савецкая моладзь—самая шчаслівая моладзь у свеце. Яна карыстаецца найшырэйшымі правамі, запісанымі ў Сталінскай Канстытуцыі. Моладзь актыўна ўдзельнічае ў кіраванні дзяржавай. Лепшыя яе прадстаўнікі выбраны ў вярхоўныя органы ўлады СССР і саюзных рэспублік. Сотні і тысячы маладых стаханаўцаў, ударнікаў вылучаны на адказныя пасты камандзіраў гаспадарчага і культурнага будаўніцтва. Дуся Віпаградава, Тася Одзінцова, Марыя Дземчэнка—хто не ведае гэтых слаўных дочак ленінска-сталінскага комсамола!

Савецкі ўрад адзначыў заслугі комсамола ў арганізацыі працоўнага ўздыму мас, соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва і ўзнагародзіў яго ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Савецкай моладзі забяспечана права на адукацыю, якое ўвасоблена ў такіх выдатных лічбах: 33 мільёны навучаючыхся ў пачатковых, няпоўных сярэдніх і сярэдніх школах, 700 тысяч студэнтаў у тэхнікумах, 550 тысяч у вышэйшых навучальных установах. На народную асвету савецкая ўлада выдаткавала за годы двух пяцігодак 50 мільярдаў рублёў. У адной Савецкай Беларусі ёсць 22 вышэйшыя навучальныя ўстановы, 99 тэхнікумаў і каля 8 тысяч школ.

Шчаслівае жыццё моладзі ў СССР прадстаўляе рэзкі кантраст з незабяспечаным і бяспраўным становішчам працоўнай моладзі ў капіталістычных краінах, дзе фашызм знішчае навуку і культуру. Капіталізм прадастаўляе маладым пролетарыям толькі адну перспектыву—быць гарматным мясам фашысцкіх агрэсараў у іх імперыялістычных войнах. У адказ на гэта шырока разгарнуўся антыфашысцкі рух барацьбы за мір, у яго радах ужо налічваецца 40 мільёнаў удзельнікаў.

Савецкая моладзь памятае словы вялікага Сталіна аб капіталістычным абкружэнні і вывучае ваенную справу. Яна бязмежна любіць сваю соцыялістычную радзіму, яна ў любы час гатова да абароны яе свяшчэнных рубяжоў і біць ворага там, адкуль ён пойдзе на нас. Японскія самураі, якія імкнуліся парушыць недатыкальнасць савецкай зямлі, адчулі на ўласнай скуры ля возера Хасан сілу і моц савецкай зброі, сілу і моц Чырвонай Арміі—арміі савецкага народа, большасць якой складае моладзь.

Ленінска - сталінскі комсамол аказаў велізарную дапамогу сваёй роднай комуністычнай партыі ў барацьбе з трацкісцка-бухарынскімі і буржуазна-нацыяналістычнымі агентамі фашызма на ўсіх участках гаспадарчага і культурнага будаўніцтва. На гераічную барацьбу за соцыялізм комсамольцаў і савецкую моладзь натхняюць свяшчэнныя пачуцці савецкага патрыятызма, гарачай любві да сваёй радзімы, бязмежнай адданасці партыі Леніна — Сталіна.

Комсамольцы павінны і ў далейшым няспынна павышаць свой ідэйны ўзровень, павышаць рэволюцыйную пільнасць, авалодваць тэорыяй марксізма-ленінізма, вывучэнне якой яшчэ мацней згуртуе іх вакол комуністычнай партыі.

Кожны комсамолец павінен вывучыць і моцна засвоіць гісторыю ВКП(б). Гэта каштоўнейшая навуковая крыніца для авалодання большэвізмам, для авалодання тэарэтычнымі асновамі комуністычнай партыі марксізмам-ленінізмам. Узброіць комсамольцаў веданнем гісторыі ВКП(б)—галоўная задача парторганаў і кіраўнікоў комсамольскіх арганізацый.

Няхай жыве слаўны юбіляр—ленінска-сталінскі комсамол!

Няхай жыве комуністычная партыя, выхаваўшая шматмільённы комсамол!

Няхай жыве вялікі Сталін!



„Всесоюзный ленинский коммунистический союз молодежи является массовой беспартийной организацией, примыкающей к ВКП(б), объединяет в своих рядах широкие слои передовой, политически грамотной трудящейся молодежи города и деревни. ВЛКСМ имеет своей задачей помощь коммунистической партии (большевиков) в деле воспитания молодежи и детей в духе коммунизма. Сочувствуя программе ВКП(б), ВЛКСМ помогает партии большевиков и советскому правительству в выполнении великой исторической задачи—строительство коммунистического общества.

ВЛКСМ является помощником ВКП(б) и ее резервом".

ЛЕНІНСКАМУ КОМСАМОЛУ

Цэнтральны Камітэт Усесаюзнай Комуністычнай партыі (большэвікоў) вітае Ленінскі Комсамол у дзень яго дваццацігоддзя.

За дваццаць год Комсамол прайшоў слаўны шлях барацьбы і перамог. Комсамол выхаваў дзесяткі і сотні тысяч выдатных савецкіх людзей, мужных, бясстрашных байцоў Савецкага народа, лепшых прадстаўнікоў маладога пакалення рабочых, калгаснікаў, савецкай інтэлігенцыі, якія не пакладаючы рук працуюць ва ўсіх галінах соцыялістычнага будаўніцтва, у арміі і ў школе, на будоўлях і на заводах, у соўгасах і калгасах, у галіне навукі, тэхнікі і мастацтва, у Саветах, у профсаюзах, у каапераціі.

Гэтых поспехаў Комсамол дабіўся таму, што ён заўсёды змагаўся пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі, высока трымаў сцяг Леніна — Сталіна, аб'ядноўваючы вакол яго мільёны працоўнай моладзі, заўсёды з'яўляўся верным памочнікам партыі, яе баявым рэзервам.

Гэтыя поспехі былі-б больш значнымі і ўсебаковымі, калі-б ЦК ВЛКСМ не дапусціў у апошні час рад сур'ёзных памылак у справе ідэйнага выхавання моладзі, ачышчэння Комсамола ад варожых элементаў і вылучэння новых кадраў комсамольскіх работнікаў на кіруючую работу.

ЦК ВКП(б) жадае Ленінскаму Комсамолу поспехаў у справе выхавання нашай моладзі ў духу марксізма-ленінізма, у духу непрымірымай барацьбы з ворагамі народаў СССР, у духу далейшага ўмацавання брацкіх уз салідарнасці паміж працоўнымі ўсяго свету.

ЦК ВКП(б) упэўнен, што ўзброены вучэннем марксізма-ленінізма, Комсамол праявіць яшчэ больш ініцыятывы і дысцыплінаванасці ва ўсіх галінах соцыялістычнай гаспадаркі і культуры, у справе ўзмацнення абароназдольнасці нашай краіны, умацавання нашай арміі, нашага флота, нашай авіяцыі.

ЦК спадзяецца, што Комсамол і ў далейшым будзе самааддана выконваць свой абавязак перад Савецкай радзімай і міжнародным пролетарыятам.

Няхай жыве савецкая моладзь!

Няхай жыве Ленінскі Комсамол!

Цэнтральны Камітэт Усесаюзнай Комуністычнай Партыі (большэвікоў)

ЯНКА КУПАЛА

НАША МОЛАДЗЬ

Мілая моладзь, слаўная моладзь
Нашай бязмежнай краіны!
Горы і моры можаш ты здолець,
Сэрцам расплавіць ільдзіны.

Знала паходы у цёмныя ночы,
Гіканне хэўры варожай,
Смерці глядзела вочамі ў вочы,
Ястраб начлегі трывожыў.

З гонарам выйшла, з яснаю славай,—
Сёння грыміш перамогай;
Перад табою у зорных праявах
Сцелецца к сонцу дарога.

Вёсны прыходзяць, вёсны адходзяць,
Моладзь красуе заўсёды;
Слаўная вечна ў вечным народзе,
Славу будуе з народам.

Весела квецца ў небе вясёлка,
Скрозь хмары-воблакі свеціць...
«Я—комсамолец! Я комсамолка!»—
Хто лепей скажа на свеце?!

Менск, 29.10. 1938 г.

ЮБІЛЕЙНЫ ПЛЕНУМ ЦК ВЛКСМ

Знамянальная дата — XX - годдзе Усесаюзнага Ленінскага Комуністычнага Саюза Моладзі — была адзначана 29 кастрычніка ў Маскве юбілейным пленумам ЦК ВЛКСМ разам з грамадскімі арганізацыямі ў Вялікім тэатры Саюза ССР.

Да 18 гадзін тэатр запоўніла жыццёрадасная савецкая моладзь. Тут — комсамольскі актыў, маладыя стаханаўцы фабрык і заводаў Масквы, прадстаўнікі Чырвонай Арміі, навукі, культуры, мастацтва, грамадскіх арганізацый. Сярод прысутных—многа старых комсамольцаў.

У яркія фарбы ўбрана сцэна Вялікага тэатра. У глыбіні яе сярод жывых кветак бюст Леніна і мастацкі партрэт таварыша Сталіна. Заяе вялікае ізабражэнне ордэнаў Чырвонага Сцяга і Працоўнага Чырвонага Сцяга, якімі комсамол узнагароджан за выдаючыяся баявыя заслугі ў эпоху грамадзянскай вайны і на фронце гаспадарчага будаўніцтва.

Святочны настрой, які пануе ў зале, нечакана выліваецца ў бурную, усхваляваную авацыю. На сцэне паяўляюцца таварышы Сталін, Молатаў, Кагановіч, Варашылаў, , Андрэеў, Мікаян, Ежоў, Жданаў, Хрушчоў, Косараў, Будзённы, Швернік. Тут-жа знатныя людзі Савецкага Саюза — тт. Папанін, Алексей Стаханаў, О. Ю. Шмідт, Нікалай Каманін, Паша Ангеліна і інш.

З усіх канцоў тэатра лясуцца воклічы: «Няхай жыве таварыш Сталін!», «Прывітанне Сталіну!», «Таварышу Сталіну комсамольскае «ура!», «Няхай жыве таварыш Молатаў!». Сабраўшыеся горача вітаюць правадыра, настаўніка і друга савецкай моладзі, кіраўнікоў партыі і ўрада, Цэнтральны Камітэт магутнай большэвіцкай партыі, якая пад кіраўніцтвам Леніна і Сталіна выпеставала і ўзрасціла многамільённы комсамол.

Авацыя сціхае. Сакратар Цэнтральнага Камітэта ВЛКСМ тав. Косараў гаворыць кароткую ўступную прамову. Ен гаворыць аб 20-гадовым шляху комсамола.

— Сёння мы, Ленінскі комсамол,— гаворыць тав. Косараў, — падводзім вынікі сваёй работы. Пройдзены шлях быў багаты. Але нас чакаюць яшчэ больш складаныя, яшчэ больш адказныя задачы. Пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі, яе Сталінскага Цэнтральнага Камітэта, Ленінскі комсамол здолее ўскрыць усе памылкі, недахопы ў сваёй рабоце і да канца выкарчаваць трацкісцка - бухарынскіх шпіёнаў і шкоднікаў, якія абманным шляхам прабраліся ў рады комсамола.

Тав. Косараў абвяшчае ўрачысты сход, прысвечаны XX-годдзю ВЛКСМ, адкрытым.

У ганаровы прэзідыум пад гром рукаплясканняў выбіраюцца таварышы Сталін, Молатаў, Кагановіч, Варашылаў, Калінін, Андрэеў, Мікаян, Жданаў, Ежоў, Хрушчоў, Дзімітраў, Хосе Дыяс, Тэльман.

З велізарным натхненнем і ўздымам сход прымае прывітанне таварышу Сталіну.

Слова для даклада атрымлівае тав. Косараў.

Пасля даклада тав. Косарэва з яркай прамовай выступае сакратар Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) тав. А. А. Жданаў, сустрэты бурнымі працяглымі апладысментамі.

Ад комсамольцаў і моладзі горада Леніна і Ленінградскай вобласці выступае тав. Сергееў.

— Сёння, — гаворыць ён, — мы ўрачыста абяцаем Цэнтральнаму Камітэту Комуністычнай партыі і таварышу Сталіну, што Ленінска-Сталінскі комсамол і яго старэйшая арганізацыя — горада Ленінграда — будзе выхоўваць моладзь на вялікім сталінскім павеставанні — гісторыі ВКП(б), якая расказвае аб гераічных справах нашай партыі ў барацьбе за комунізм.

Ад імя савецкай інтэлігенцыі слова прадастаўляецца дэпутату Вярхоўнага Совета РСФСР — маладому прафесару тав. Собалеву.

Усхваляванай авацыяй сход сустракае дэлегацыю Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Ваенна-Морскага Флота.

Герой Савецкага Саюза тав. Ерэменка ад імя байцоў, камандзіраў і палітработнікаў Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота перадае юбіляру баявое чырвонаармейскае прывітанне.

— Ленінска-Сталінскі комсамол, — гаворыць тав. Ерэменка, — з гонарам выконвае свае шэфскія абавязкі над Ваенна-Марскім і Ваенна-Паветраным Флотам.

Мы памятаем аб капіталістычным акружэнні, мы заўсёды гатовы. Ніякія выпадковасці і ніякія фокусы нашых знешніх ворагаў не застыгнуць нас знянацку. Савецкі народ не дазволіць фашыстам таптаць свяшчэнную зямлю нашай шчаслівай радзімы. Па першаму закліку партыі Леніна—Сталіна і савецкага ўрада Чырвоная Армія агнём і сталлю прыкрые нашу радзіму і пакажа ворагу ўсю сілу сваёй арганізаванасці і баявой магутнасці.

Дэлегацыя піонераў і школьнікаў сталіцы вітае слаўнага юбіляра.

Сабраўшыеся паслалі прывітанне Цэнтральнаму Камітэту Усесаюзнай комуністычнай партыі, таварышам Молатаву, Варашылаву, Выканкому Комуністычнага Інтэрнацыянала і яго кіраўніку тав. Дзімітраву.

Прынят таксама зварот да ўсіх членаў ВЛКСМ і моладзі Савецкага Саюза.

Урачысты сход закончыўся вялікім канцэртам з удзелам піонерскага ансамбля песні і пляскі Цэнтральнага дома піонераў, вучняў Цэнтральнай музыкальнай школы Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі, лаўрэатаў усесаюзных і міжнародных конкурсаў, маскоўскіх і ленінградскіх артыстаў.

Таварышу Міхаілу Майсеевічу КАГАНОВІЧУ

Цэнтральны Камітэт ВКП(б) і Совет Народных Камісараў СССР у дзень Вашага пяцідзесяцігоддзя шлюць Вам—старому большэвіку з гвардыі Леніна, аднаму з арганізатараў соцыялістычнай індустрыі—гарачае большэвіцкае прывітанне.

Цэнтральны Камітэт ВКП(б) і Совет Народных Камісараў СССР жадаюць Вам многіх год плённай работы па ўмацаванню абароназдольнасці нашай краіны і будаўніцтву соцыялістычнага грамадства.

По даручэнню ЦК ВКП(б) і СНК Саюза ССР

І. СТАЛІН. В. МОЛАТАЎ.

У РОДНАЙ СТАЛІЦЫ

СУСТРЭЧА ГЕРАІНЬ-ЛЁТЧЫЦ НА БЕЛАРУСКІМ ВАКЗАЛЕ

Вясёлым ажыўленнем была напоўнена 27 кастрычніка сталіца. З берагоў далёкай ракі Амгуні вярнуліся ў родны горад адважныя лётчыцы, зрабіўшыя бліскучы пералёт Масква—Далёкі Усход. Сталіца ўрачыста сустрэла мужных дачок совецкага народа. Масква з раніцы ўпрыгожылася Вуліца Горкага, якая вядзе да Беларускага вакзала, места сустрэчы — упрыгожылася сцягамі, плакатамі. К 14 гадзінам дня па абодвух баках магістралі выстраіліся дзесяткі тысяч жыхароў сталіцы. Плошча ля Беларускага вакзала перапоўнена.

Людна і ажыўлена на пероне. З велізарнымі букетамі кветак прыходзяць блізкія, прыяцелі лётчыц. На адной з платформ выстраілася ганаровая варта.

К моманту прыходу поезда на вакзал прыбываюць таварышы Л. М Кагановіч, Н. С. Хрушчоў, А. Е. Бадаеў, М. М. Кагановіч, С. М. Будзённы, Е. Яраслаўскі. А. Д. Лакціонаў. Тут-жа Героі Совецкага Саюза тт. Чкалаў Громаў. Папанін, Молакаў, О. Ю Шмідт, Бялякоў. Данілін, Спірын. Слепнёў, Крэнкель, дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР і РСФСР, члены ўрадавай камісіі па пералёту, авіятары, канструктары самалётаў і іншыя.

14 гадзін 30 мінут. Змяншаючы свой бег, поезд спыняецца ля платформы Адбываецца гарачая хвалюючая сустрэча. Грымяць воплескі. Усе горача вітаюць выходзячых з вагона Валянціну Грызадубаву, Паліну Осіпенка і Марыну Раскову.

Баявы экіпаж «Родины» прымае рапарт ганаровай варты і затым накіроўваецца па перону к выхаду Тут сустракаючых яшчэ больш, адусюль сардэчныя воклічы.

Тысячы людзей на плошчы ля вакзала бурна вітаюць таварышаў Грызадубаву, Осіпенка і Раскову. Горача вітаюць кіраўнікоў партыі і ўрада, партыю Леніна—Сталіна, выхаваўшую такіх выдатных дачок соцыялістычнай радзімы.

Мітынг, прысвечаны сустрэчы гераічнага экіпажа самалёта «Родина», адкрывае начальнік Ваенна-Паветраных сіл РСЧА камандарм 2-га ранга тав. А. Д. Лакціонаў Ад імя ўрадавай камісіі па пералёту і Ваенна-Паветраных сіл РСЧА ён перадае гераічным лётчыцам палкае прывітанне і віншуе іх з выдатным поспехам, з устанаўленнем новага міжнароднага жаночага рэкорда.

— Сваім здзіўляючым гераічным пералётам, — гаворыць тав Лакціонаў,— нашы лётчыцы даказалі ўсяму свету, на якія подзвігі здольны жанчыны вялікай краіны соцыялізма. Экіпаж самалёта «Родина» ўпісаў слаўныя старонкі ў гісторыю перамог нашай авіяцыі. Гэты велізарны поспех дасягнут дзякуючы таму, што нашу краіну вядзе ад перамогі да перамогі слаўная комуністычная партыя, вялікі правадыр працоўных таварыш Сталін.

Першае слова прадастаўляецца сакратару ЦК ВКП(б) і намесніку старшыні Соўнаркома СССР тав. Л М Кагановічу Ён вітае слаўных дачок нашай гераічнай радзімы ад імя Цэнтральнага Камітэта Усесаюзнай Комуністычнай партыі (большэвікоў) і Совета Народных Камісараў Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік.

З'яўленне таварыша Л. М. Кагановіча ля мікрафона было спаткана доўга незмаўкаючымі апладысментамі і захопленымі воклічамі ў гонар вялікага Сталіна, у гонар гераічных лётчыц нашай вялікай радзімы.

Прамова таварыша Л. М. КАГАНОВІЧА

Дарагія таварышы Валянціна Грызадубава, Паліна Осіпенка і Марына Раскова! Вам, смелым і стойкім гераіням, слаўным дочкам нашай соцыялістычнай радзімы, упісаўшым новыя гераічныя старонкі ў гісторыю нашай слаўнай авіяцыі, перадаю гарачае большэвіцкае прывітанне ад Цэнтральнага Камітэта партыі Леніна—Сталіна і Совета Народных Камісараў Совецкага Саюза. **(Апладысменты).**

Цэнтральны Камітэт большэвіцкай партыі і Совет Народных Камісараў віншуюць вас і разам з вамі ўвесь совецкі народ з паспяховым, выдатным завяршэннем беспасадачнага пералёту Масква — Далёкі Усход.

Уся краіна. рабочыя, служачыя, сяляне, інтэлігенцыя, наша слаўная моладзь і асабліва жанчыны з напружаннем і хваляваннем сачылі за вашым гераічным пералётам і работай нашых далёкаўсходніх лётчыкаў, аказаўшых вам дапамогу.

Вы, таварышы Грызадубава, Осіпенка і Раскова. правільна пісалі ў сваёй тэлеграме з Кербі таварышу **Сталіну,** што сярод балот, сопак, у глухой тайзе вы не былі адзінокімі, што з вамі— увесь многамільённы народ, уся партыя і наш вялікі, любімы, родны бацька і друг таварыш **Сталін. (Бурныя апладысменты).**

Іменна таму ў вас і ў вашых родных, ва ўсяго вашага народа, у Цэнтральнага Камітэта і ўрада была цвёрдая ўпэўненасць у поспеху вашай справы.

Партыя і яе Цэнтральны Камітэт, урад надавалі і надаюць велізарнае значэнне вашаму дальняму пералёту на самалёце «Родина» і высока цэняць атрыманыя вамі перамогі і бліскучыя рэзультаты.

Таварышы! Нашы легендарныя лётчыцы пакрылі па маршруту 6450 кілометраў, а па прамой — каля 6 тыс. кілометраў на працягу 26 гадзін 29 мінут. Гэта на 1 500 кілометраў больш існуючага жаночага міжнароднага рэкорда на дальнасць, устаноўленага французскай лётчыцай.

Праз туманы і воблакі. над лясамі і горамі, над вадой і тайгой праляцелі нашы гераіні-лётчыцы, каб выканаць заданне партыі і ўрада, заслужыць адабрэнне народа і правадыра народаў таварыша Сталіна, праславіць сваім подзвігам нашу вялікую соцыялістычную радзіму, імем якой названы іх выдатны самалёт.

Такія авіяцыйныя пералёты праводзяцца не ўпершыню ў нашай краіне. Нашы любімыя лётчыкі ўпісалі нямала слаўных старонак аб сваіх гераічных справах у гісторыю барацьбы нашай радзімы. Пералёты Чкалава. Байдукова, Белякова, Громава, Юмашэва, Даніліна, праляцеўшых праз Паўночны полюс, пералёты выдатных майстраў арктычных рэйсаў Молакава і Вадап'янава, выдатнае майстэрства Уладзіміра Кокінакі, устанавіўшага рэкорд пералёту Масква — раён Далёкага Усхода і многія іншыя выдатныя дасягненні герояў нашай слаўнай авіяцыі, гераізм слаўнай папанінскай чацвёркі ярка сведчаць перш за ўсё аб росце культуры людзей, аб росце нашай матэрыяльна-тэхнічнай культуры і ўсёй авіяцыйнай прамысловасці.

Пералёт трох гераінь увойдзе ў рад самых гераічных палётаў Аднак, таварышы, у ім ёсць і свае асаблівасці і свая каштоўнасць Асаблівая каштоўнасць гэтага пералёту заключаецца ў тым. што гэта — першы авіяцыйны рэкорд жанчын-гераінь. Аб жанчыне **Ленін** пісаў: «Ва ўсіх цывілізаваных краінах, нават самых перадавых, становішча жанчыны такое, што недарма іх называюць хатнімі рабынямі».

Жанчына пры капіталізме, у асаблівасці ў краінах фашысцкага варварства, пастаўлена ў становішча ніжэйшай істоты.

Зусім іншая справа ў нашай соцыялістычнай краіне Кастрычніцкая соцыялістычная рэволюцыя. Сталінская Канстытуцыя паставілі жанчыну ў роўнапраўнае становішча і забяспечылі росквіт творчых сіл нашых жанчын У сваёй справаздачы XVII з'езду партыі таварыш Сталін дакладваў аб растучай грамадскай актыўнасці совецкіх жанчын. Таварыш Сталін гаварыў:

«... Жанчыны складаюць палавіну насельніцтва нашай краіны, яны складаюць велізарную армію працы, і яны заклікаюць выхоўваць нашых дзяцей, наша будучае пакаленне. г. зн нашу будучыню Вось чаму мы не можам дапусціць, каб гэта велізарная армія працоўных празябала ў цемры і невуцтве! Вось чаму мы павінны вітаць растучую грамадскую актыўнасць працоўных жанчын і іх вылучэнне на кіруючыя пасты, як несумненную адзнаку росту нашай культурнасці».

На прыёме калгасніц-ударніц бурачных палёў у 1935 годзе таварыш Сталін гаварыў:

«Мы слухалі прамовы жанчын, не звычайных. а, я-б сказаў, **жанчын—гераінь працы,** таму што толькі гераіні працы маглі дабіцца тых поспехаў, якіх яны дабіліся. У нас не бывала раней такіх жанчын... Гэта зусім новыя людзі...

... Такіх жанчын не бывала і не магло быць у стары час».

Жанчыны ў нашай соцыялістычнай краіне даўно разбілі сваё векавое заняволенне і старую гнілую тэорыю быццам жанчыны не здольны да вялікіх гераічных спраў. Перадавыя работніцы стаханаўкі. жанчыны-інжынеры, жанчыны-вучоныя зараз ужо не адзінкавая, а масавая з'ява. Пад кіраўніцтвам партыі большэвікоў і дзякуючы штодзённым клапатлівым адносінам таварыша Сталіна жанчыны заваёўваюць усё новыя і новыя пазіцыі не толькі ў грамадскім жыцці, але ў асаблівасці за апошнія гады і ў галіне навукі і тэхнікі.

Не выпадкова, што якраз у дні пералёту тт. Грызадубавай. Осіпенка, Расковай мы мелі рад новых праяў гераізма совецкіх жанчын, новы рэкорд лётчыцы Меднікавай, развіццё шырокага руху жанчын на чыгуначным транспарце за авалоданне тэхнікай вадзення паравозаў. Жанчыны-машыністы ўжо ёсць на чыгуначным транспарце.

У нас ёсць нямала жанчын-лётчыц. Але трэба прызнаць, што да апошняга вашага пералёту былі яшчэ людзі, якія трымаліся старой пагаворкі: «Баб'я дарога—ад печы да парога» **(Смех).** Яны думалі, што для гераічных дальніх пералётаў жанчыны не прыстасаваны. А вось вы. таварышы Грызадубава, Осіпенка і Раскова, разбілі гэту пагаворку кансерватараў Вашым парогам, таварышы Грызадубава, Осіпенка і Раскова, аказаўся Вялікі Ціхі акіян. ваша дарога аказалася адлегласцю ў шэсць тысяч кілометраў. Вы паказалі, на што здольны совецкія жанчыны Вы адкрылі новую старонку ў гісторыі развіцця другой паловы чалавецтва — жанчыны. **(Апладысменты).**

Таварышы, асабліва каштоўна тое, што вы, гераічныя лётчыцы, не толькі аказаліся таленавітымі лётчыкамі, праявіўшымі адвагу і гераізм, але вы праявілі ў найцяжэйшых умовах тайгі выключную храбрасць, халоднакроўе, вынослівасць. якім могуць пазайздросціць многія і многія мужчыны. Вы наглядна паказалі, што жанчыны— гэта вялікі рэзерв творчай энергіі вялікага свабоднага совецкага народа. Капіталізм замарожваў гэты рэзерв чалавецтва Соцыялізм ажывіў і падняў на высокую ступень культуру, адвагу, геройства, смеласць і храбрасць працоўнай жанчыны

Раней і цяпер нават у самых дэмакратычных буржуазных рэспубліках фактычна працоўныя знаходзяцца ў становішчы галечы і наёмнага рабства, а жанчына — у становішчы падвоенага рабства. Яна з'яўляецца рабыняй удвая — як працоўная і як жанчына

Цяпер мы ўправе сказаць, што совецкая жанчына, зрабіўшая гераічны подзвіг,—гераіня ўдвая Цяпер сталінскае выхаванне адкрывае новыя магчымасці для працоўнай жанчыны, для развіцця яе творчых сіл у нашай краіне як у мірны так і ў ваенны час.

Таварышы Грызадубава, Осіпенка і Раскова паказалі, што ў Совецкай краіне выраслі гераіні, якія ў любы момант гатовы рушыць у бой з ворагамі народа. з ворагамі нашай вялікай радзімы **(Бурныя апладысменты).**

Вы ведаеце, таварышы, з якой любоўю, з якімі клопатамі адносяцца наша партыя наш вялікі **Сталін** да герояў нашай краіны, на якіх-бы франтах соцыялістычнага будаўніцтва яны ні знаходзіліся — у гарадах і сёлах, на фабрыках і заводах, на чыгуначных станцыях, у соўгасах і калгасах у далёкай тайзе і ў цэнтры Совецкай краіны, у нашай чырвонай, выдатнай сталіцы — у Маскве Усюды ёсць зараз сотні і тысячы герояў. якіх партыя большэвікоў з дня ў дзень вырошчвае, выкоўвае, выпестоўвае.

Якраз у гэтыя тыдні вышла з друку кніга «Гісторыя ВКП(б)», гісторыя партыі **Леніна—Сталіна.** Гэта вялікае **сталінскае павестваванне** аб гераічных справах нашай партыі, аб гераічных справах нашага народа. аб тых перамогах, якія атрыманы ў дні Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі пад кіраўніцтвам **Леніна і Сталіна,** аб тых перамогах, якія атрыманы нашым народам учора і сёння пад мудрым, выдатным, небывалым у гісторыі чалавецтва кіраўніцтвам нашай партыі і нашага вялікага таварыша **Сталіна. (Апладысменты).**

Таварышы, наша любоў, любоў нашай партыі і совецкага народа да герояў і гераінь не носіць толькі ўрачыста-святочны характар Гераізм — гэта плоць ад плоці нашай вялікай партыі, нашага вялікага народа Усе вялікія гераічныя справы. якія тварылі наша вялікая партыя і пад яе кіраўніцтвам наш народ на працягу дзесяткаў год, у годы барацьбы з царскім гнётам, рабствам і жабрацтвам, у годы барацьбы за вызваленне. калі былі скінуты ланцугі рабства і знішчан капіталізм. калі ў грамадзянскай вайне мы перамаглі, і зараз, калі мы будуем наша шчаслівае, заможнае, культурнае жыццё, — усё гэта адзіны ланцуг гераічнай барацьбы. радасці і працы нашага народа, нашай вялікай партыі.

Гераічны рабочы клас, увесь працоўны народ стварылі сваю гераічную партыю і ствараюць сваіх герояў. Гераічная эпоха будаўніцтва соцыялізма нараджае гераічных людзей, нараджае гераічныя справы.

У процілегласць буржуазным краінам у нас паміж героямі, вышаўшымі з народа, і самім народам існуе неразрыўная сувязь.

Зараз, калі мы выкрылі і разбілі ворагаў народа, якія перашкаджалі нам і якія хацелі знішчыць шчасце народа. зараз мы з новай сілай ідзем да новых перамог, і ўсё больш і больш гераічных спраў будзе рабіцца ў нас. Вось чаму, таварышы, наш народ любіць сваіх герояў, вось чаму таварышаў Грызадубаву, Осіпенка і Раскову сустракае ўвесь народ. Усе ад старога да малога хваляваліся за іх лёс, радуюцца іх поспехам і з любоўю ад усяго сэрца прэпадносяць ім сваё гарачае сталінскае прывітанне. **(Апладысменты).**

Не выпадкова асаблівую любоў заваявалі героі-лётчыкі. Наша авіяцыя — гэта дзецішча сталінскай індустрыялізацыі, лётчыкі — гэта гордыя сокалы, выхаваныя любоўна, клапатліва таварышам Сталіным. Без якога-небудзь перапавелічэння мы можам сказаць, што тварцом нашай авіяцыі з'яўляецца таварыш Сталін. **(Апладысменты)** Авіяцыя — гэта вышэйшае выражэнне нашых дасягненняў. Магутнасць нашай авіяцыі даказана выдатнымі фактамі жыцця, супроць якіх самыя нахлыя ілгуны з лакеяў фашызма бяссільны. Не толькі прыяцелі, але і ворагі вымушаны прызнаваць высокія якасці нашых самалётаў і нашых слаўных лётчыкаў. Нашы самалёты лятаюць далёка і высока. Наша краіна вялікая. Мы павінны асвойваць новыя воблаці і не выпадкова грамадзянская авіяцыя на Поўначы шырока развілася.

Авіяцыя мае і гаспадарчае і культурнае значэнне. Палёты Чкалава, Кокінакі і гераічнай тройкі жанчын маюць велізарную каштоўнасць палепшання і паскарэння сувязі з буйнейшым краем — Далёкім Усходам.

Але, таварышы, мы не толькі аб гэтым думаем.

Мы акружаны капіталістычнымі краінамі, сярод якіх ёсць крайне агрэсіўныя фашысцкія элементы. якія правацыруюць вайну з намі Іменна таму мы клапоцімся, каб нашы самалётыляталі-б далёка і высока. Мы не прэтэндуем на чужыя землі, але калі хто паспее прэтэндаваць хапя-б на самы малы кавалачак нашай зямлі то мы сумеем насцігнуць яго нашымі самалётамі і адагнаць любога агрэсара ад нашай свяшчэннай совецкай зямлі. Вось чаму мы імкнемся, каб нашы самалёты ляталі далёка і высока. Мы хочам, каб нашы самалёты ляталі быстрэй, каб ворагі, якія пасмее пасягнуць на нашу зямлю, спішчаць на яго-ж тэрыторыі. **(Бурныя апладысменты).**

Усім памятны дні падзей ля возера Хасан. Наглыя правакатары з японскай ваеншчыны напалі на совецкую зямлю. Усе мы памятаем гістарычныя словы таварыша Сталіна: «Гэту палітыку міру будзем весці і надалей усімі сіламі. усімі сродкамі. Ніводнай пядзі чужой зямлі не хочам. Але і сваёй зямлі, ніводнага вяршка сваёй зямлі не аддадзім нікому». І калі папрабавалі ворагі ўзяць гэтую пядзь нашай зямлі, то нашы героі Чырвонай Арміі, чырвонай авіяцыі адказалі «ударам на ўдар падпальшчыкаў вайны» (Сталін).

Пры абароне ля возера Хасан разам з іншымі віламі зброі слаўна паказала сябе наша авіяцыя.

Ля возера Хасан ворагу дан «сакрушальны адпор, каб надалей непавадна было ім соваць сваё свіное рыла ў наш совецкі агарод» (Сталін) **(Апладысменты).** Няхай у далейшым улічаць гэты ўрок не толькі далёкаўсходнія. але і заходнія правакатары вайны.

Нам-жа неабходна і далей умацоўваць абароназдольнасць нашай радзімы.

Авіяцыя ў абароне займае важнейшае месца. Таму пералёт таварышоў Грызадубавай, Осіпенка і Расковай, як і пералёт Чкалава і Кокінакі, умацоўвае абарону Совецкага Саюза.

Горача вітаючы сёння нашых гераінь-лётчыц, мы гаворым ім і ўсяму народу — з такімі людзьмі, з такой Чырвонай Арміяй. як героі Хасана, мы разаб'ем на-галаву любога ворага, які адважыцца напасць на свяшчэнную зямлю нашай радзімы. **(Бурныя апладысменты).**

Адчуваючы пачуццё радасці і гордасці за гераічных дачок нашай радзімы, увесь народ звяртае свае погляды, любоў і адданасць да вялікага тварца новага жыцця, да комуністычнай партыі — да любімага роднага таварыша Сталіна і кожны працоўны разам з гераінямі гаворыць свайму правадыру: як пуцяводная зорка, ты асвятляеш героям шлях да вялікіх гістарычных спраў. Твае бацькоўскія сардэчныя клопаты аб людзях, у асаблівасці аб героях-лётчыках, выклікаюць новую энергію для новых гераічных подзвігаў у сэрцах соцень і тысяч людзей. Пад кіраўніцтвам партыі, пад тваім мудрым кіраўніцтвам, наш вялікі кормчы, мы здольны на новыя гераічныя справы Так вядзі-ж нас наперад да новых перамог комунізма, да поўнага разгрому ўсіх ворагаў працоўнага чалавецтва. **(Бурныя апладысменты).**

Няхай жыве наша вялікая непераможная большэвіцкая партыя, выхоўваючая такіх гераінь, як Грызадубава, Осіпенка і Раскова!

Няхай жыве вялікі совецкі народ і яго правадыр, арганізатар вялікіх перамог, наш любімы, родны таварыш Сталін! **(Бурная авацыя, воклічы «ура»).**

* * *

Пасля прамовы тав. Л. М. Кагановіча слова прадастаўляецца інжынеру завода № 156 тав. Абрубаву Ён выступае ад імя рабочых, інтэлігенцыі і ўсіх працоўных сталіцы, ад імя стаханаўцаў і ўдарнікаў свайго завода. Звяртаючыся да экіпажа самалёта «Родина», ён гаворыць:

— Мы віншуем вас з бліскучай перамогай Вы змаглі вытрымаць іспыт і сваёй мужнасцю і настойлівасцю адолелі ўсе перашкоды на вашым шляху. Мы горды за вас. паказаўшых высокія ўзоры ў авалоданні авіяцыйнай тэхнікай Разам з усёй краінай мы радуемся вашаму поспеху

З адказнай прамовай выступае камандзір самалёта «Родина» таварыш В. С. Грызадубава Дзесяткі тысяч працоўных сталіцы, якія запоўнілі велізарную прывакзальную плошчу. захоплена вітаюць гераічны экіпаж самалёта «Родина». Над плошчай грымяць апладысменты, раздаюцца прывітальныя воклічы і крыкі «ура!» В С. Грызадубава прэадольваючы радаснае хваляванне, пачынае сваю прамову.

— Дзякуй. — гаворыць яна, — совецкаму народу за клопаты. увагу і гарачую сустрэчу! Мы шчаслівы, што выканалі заданне, даручанае нам вялікай партыяй, совецкім урадам, вялікім Сталіным. Наш самалёт, нашы маторы, пабудаваныя на нашых совецкіх заводах нашымі стаханаўцамі. канструктарамі. інжынерамі, бліскуча вытрымалі іспыт.

Далёка ў тайзе, на балоце, экіпаж самалёта «Родина» не адчуваў сябе адзінокім. Нябачныя ніці звязвалі нас з усім совецкім народам. Нас натхняла вялікая комуністычная партыя і яе ў да перамогі правадыр, настаўнік і друг вялікі Сталін.

Калі вораг, — заканчвае сваю прамову тав. Грызадубава, — пасмее пасягнуць на нашы свяшчэнныя граніцы. то на іх абарону разам з вялікай арміяй мужчын стане грандыёзная армія жанчын свабоднай соцыялістычнай краіны.

Апошнія словы тав. Грызадубавай, поўныя любві і адданасці вялікаму Сталіну, патанулі ў громе апладысментаў

У 16 гадзін 20 мінут мітынг заканчваецца Гераічныя лётчыцы Валянціна Грызадубава, Паліна Осіпенка і Марына Раскова суправаджаемыя кіраўнікамі партыі і ўрада, роднымі і блізкімі, садзяцца ва ўвітыя кветкамі машыны

Трыумфальная калона аўтамабіляў рухаецца па вуліцы Горкага, уздоўж якой выстраіліся дзесяткі тысяч масквічоў Бясстрашных лётчыц народ вітае захопленымі воклічамі.

ПРЫЁМ У КРЭМЛІ

ГЕРАІЧНАГА ЭКІПАЖА САМАЛЁТА „РОДИНА“

27 кастрычніка ў чатыры гадзіны дня ў Вялікім Крэмлёўскім палацы Цэнтральны Камітэт ВКП(б) і Урад Саюза ССР прымалі гераічны экіпаж самалёта «Родина» — таварышоў В. С. Грызадубаву, П. Д. Осіпенка і М. М. Раскову.

Пад старажытнімі зводамі Гранавітай палаты, у святочнай абстаноўцы, сабраліся лепшыя людзі совецкага народа, кіраўнікі партыі і ўрада, праслаўленыя баявыя камандзіры, адважныя лётчыкі. бліскучыя канструктары, дзеячы навукі і тэхнікі, стаханаўцы маскоўскіх заводаў. Усе радасна настроены, усе шчаслівы віншаваць трох адважных совецкіх жанчын са шчаслівым заканчэннем іх такога бліскучага пералёту.

А вось і яны самі. тры маладыя гераіні, тры шчаслівіцы. яшчэ ў дарожных касцюмах, але ўжо на выгляд зусім адпачыўшыя, зззяючыя, акружаныя роднымі. абдымаючыя сваіх дзяцей. Увесь зал радуецца карціне натуральнай і бурнай сямейнай радасці. Крохатны Саколік, сын Валянціны Грызадубавай, і васьмігадовая Таня Раскова з вялікім дастоінствам усаджваюцца паміж таварышамі Сталіным, Молатавым і Варашылавым.

Вячаслаў Міхайлавіч Молатаў ад імя Цэнтральнага Камітэта і Урада Саюза ССР агалашае першы тост за новых совецкіх гераінь—Валянціну Грызадубаву, Паліну Осіпенка і Марыну Раскову, любіміц совецкага народа. зрабіўшых бліскучы беспасадачны палёт Масква—Далёкі Усход і паказаўшых усяму свету, на які гераізм і вытрымку здольны слаўныя дочкі нашай краіны.

У адказным слове Валянціна Грызадубава горача і хвалююча гаворыць аб натхніцелю новай перамогі совецкай авіяцыі, натхніцелю і арганізатару ўсіх перамог многамільённага совецкага народа, аб цудоўным настаўніку. цвёрдым кіраўніку і ласкавым другу — аб Іосіфе Вісарыёнавічу Сталіне.

З яго імем паляцелі тры совецкія жанчыны ў свой дальні шлях, з яго імем у мыслях і на вуснах яны перамаглі ўсе труднасці і небяспекі свайго далёкага падарожжа.

Бурнай, нескančaемай авацыяй у гонар таварыша Сталіна далучаецца ўвесь зал да слоў смелай лётчыцы. Гэта авацыя паўтараецца яшчэ многа-многа раз, калі ўдзельнікі бліскучага пералёту і іншыя праслаўленыя. сусветна вядомыя лётчыкі ў сваіх выступленнях расказваюць, наколькі яны абавязаны таварышу Сталіну сваім выхаваннем, сваімі поспехамі, сваімі перамогамі.

Другі пілот Паліна Осіпенка выступае ўслед за сваім камандзірам Моцная, энергічная. жыццерадасная, поўная ўпэўненасці ў сваіх сілах, яна з велізарным уздымам гаворыць аб вялікай крыніцы, з якой чэрпаюцца гэтыя сілы, — аб салідарнасці, аб дружнай спаянасці совецкага народа. Яна гаворыць аб казачна багатым краі совецкім Далёкім Усходзе і аб яго людзях, простых і выдатных совецкіх людзях, якія не пашкадавалі нічога, каб выручыць трох лётчыц у цяжкую мінуту.

Здзіўляючай чалавечай цеплынёй прагучэлі звернутыя да таварыша Сталіна ласкавыя, задушэўныя словы Марыны Расковай.

Валерый Чкалаў агалашае тост за здароўе Вячаслава Міхайлавіча Молатава, главы ўрада, «які ніколі не ведае і не будзе ведаць крызісаў».

Александр Беляков гаворыць аб лепшай у свеце школе, ствараючай здзіўляючых байцоў-лётчыкаў. мужчын і жанчын, аб Чырвонай Арміі, і агалашае тост за баявога правадыра, кіраўніка ўзброеных сіл Совецкага Саюза, Клімента Ефрэмавіча Варашылава.

Паліна Осіпенка вітае выдатнага арганізатара нашага чыгуначнага транспарта Лазара Майсеевіча Кагановіча.

Марына Раскова гаворыць аб зоркіх вартавых. верных стражах дзяржаўнай бяспечнасці, слаўных наркомунутдзельцах і іх кіраўніку, сталінскім наркоме Нікалаю Іванавічу Ежове.

М. Громаў, Г Байдукоў, А Сераў з захапленнем гавораць аб новых планах. новых задачах. новых рэкордах, якія стаяць перад людзьмі совецкай авіяцыі.

У сваім кароткім выступленні, выслуханым з напружанай увагай і перарываемым бурнымі апладысментамі, таварыш Сталін гаворыць аб бліскучых поспехах, дасягнутых совецкімі жанчынамі ва ўсіх галінах вытворчай, культурнай навуковай работы і ў такой труднейшай і здавалася недаступнай для жанчыны галіне, як авіяцыя На ўсіх гэтых попрышчах совецкая жанчына, у спрыяючай абстаноўцы соцыялістычнага грамадства, цяпер стала побач з мужчынам і ва многіх выпадках апераджае яго.

Далей таварыш Сталін папярэджвае аб неабходнасці асаблівай асцярожнасці і беражнасці з самым драгацэнным, што ў нас ёсць,—з чалавецкімі жыццямі і асабліва з жыццямі нашых храбрых. часамі нястрымна храбрых герояў-лётчыкаў. Гэтыя жыцці даражэй нам усякіх рэкордаў, як вялікі і громкі гэтыя рэкорды ні былі б.

Таму, аберагаючы жыццё нашых герояў, спакой і шчасце іх сем'яў, партыя і ўрад будуць крайне строгі да хадайніцтваў лётчыкаў аб дазволе ім рэкордных небяспечных пералётаў і будуць дазваляць гэтыя пералёты толькі ў рэдкіх і выключных выпадках.

Адзначаючы доблесную работу заваявальнікаў Поўначы, таварыш Сталін вітае І Д. Папаніна і дружную сям'ю палярных лётчыкаў.

Віншуючы таварышоў Сахарава, Бурлакова, Раманава, Дзеркунскага, Ціханава і іншых. умела расшукаўшых у тайзе экіпаж «Родины» і адразу аказаўшых яму дапамогу, таварыш Сталін агалашае тост за радавых совецкіх лётчыкаў, якія з'яўляюцца апорай і надзеяй нашай слаўнай совецкай авіяцыі.

Бурныя авацыі суправаджаюць словы таварыша Сталіна, поўныя клопатаў і ўвагі да перадавых і адважных совецкіх людзей.

Прыём заканчваецца канцэртам Чырвонасцяжнага ансамбля чырвонаармейскай песні і пляскі Саюза ССР пад кіраўніцтвам народнага артыста СССР прафесара Александрава.

СВЯТА СОВЕЦКАГА МАСТАЦТВА

НА ЎРАЧЫСТЫМ ПАСЯДЖЭННІ, ПРЫСВЕЧАНЫМ 40-ГОДДЗЮ МАСТАЦКАГА ТЭАТРА

Незвычайнае ажыўленне і ўздым панавалі вечарам 27 кастрычніка ў Маскоўскім Мастацкім Акадэмічным тэатры СССР імя Горкага, слаўнае 40-годдзе якога радасна адзначае ўся краіна.

Вечарам тут адбылося ўрачыстае юбілейнае пасяджэнне, на якім прысутнічалі шматлікія дэлегацыі работнікаў мастацтваў саюзных рэспублік і буйнейшых гарадоў краіны, выдатныя грамадскія дзеячы, майстры мастацтваў сталіцы, пісьменнікі. мастакі, рабочыя маскоўскіх прадпрыемстваў, прадстаўнікі Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, карэспандэнты совецкага і замежнага друку. Партэр, амфітэатр, бэльэтаж, ложы—усё перапоўнена.

Ва ўрадавай ложы прысутнічаюць таварышы Сталін І. В., Молатаў В М., Кагановіч Л. М., Варашылаў К. Е., Андрэеў А. А., Мікаян А. І., Жданаў А. А., Ежоў Н. І., Хрушчоў Н. С., Булганін Н. А.

На сцэне — увесь калектыў тэатра на чале з выдатнымі майстрамі совецкага мастацтва і старэйшымі дзеячамі Мастацкага тэатра народнымі артыстамі СССР В. І. Неміровічам-Данчэнка, І. М. Масквіным, О. Л. Кніпер-Чэхавай, В. І. Качалавым, Л. М. Леанідавым. Тут-жа за сталом прэзідыума — дырэктар тэатра Я. І. Баярскі, народныя артысты СССР Е. П. Карчагіна-Александроўская, В. В. Барсава, А. А. Яблачкіна, Куляш Байсеітава, Халіма Насырава, Бюль-Бюль Мамедаў.

Урачыстае пасяджэнне адкрывае дырэктар тэатра Я. І. Баярскі. З прывітаннем ад імя Камітэта па справах мастацтваў пры Соўнаркоме СССР выступае М. В Храпчанка.

Ад імя калектыва маскоўскага аўтазавода імя Сталіна з прывітаннем выступіў тав Остраушкін.

Усхваляваную прамову гаворыць адна з старэйшых актрыс краіны — дэпутат Вярхоўнага Совета СССР, народная артыстка СССР Е. П. Карчагіна-Александроўская.

— Дарагія прыяцелі! — гаворыць яна, звяртаючыся да юбіляраў.—Мне выпаў гонар перадаць вам прывітанне, сардэчнае прывітанне ад усёй велізарнай арміі работнікаў совецкага мастацтва. Гаварыць аб вашых заслугах я не буду: наш урад выказаў волю ўсяго народа і ўсе мы з велізарнай радасцю прачыталі сёння ўказы аб высокіх узнагародах, аб новых народных і заслужаных артыстах РСФСР.

Няма меры ўдзячнасці вашым слаўным стваральнікам—Канстанціну Сергеевічу Станіслаўскаму і Уладзіміру Іванавічу Неміровічу-Данчэнка і ўсім работнікам вашага тэатра.

Добра сказаў Канстанцін Сергеевіч Станіслаўскі: «Большэвікі любяць праўду жыцця і праўду ў мастацтве». Якраз за гэта і любяць ваш тэатр большэвікі партыйныя і непартыйныя, любіць увесь совецкі народ.

За тое, што развіваюцца наша культура і мастацтва. за тое, што расквітнеў у гэтыя годы Мастацкі тэатр, — прыношу глыбокую падзяку нашай партыі і нашаму дарагому таварышу Сталіну.

Заключныя словы прамовы тав. Карчагінай-Александроўскай выклікаюць бурную авацыю. Усе прысутныя падымаюцца з месц. Грыміць «Інтэрнацыянал». Воплескі і грамовае «ура» не сціхаюць на працягу доўгіх мінут.

Любоў совецкага народа да Мастацкага тэатра — перадавога тэатра краіны — выражаюць прамовы народнага артыста РСФСР Р. Н. Сіманава, дэпутата Вярхоўнага Совета РСФСР т. Л. Ф. Кушч, выступіўшага ад імя байцоў і камандзіраў Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, дэпутата Вярхоўнага Совета СССР пісьменніка А. Е. Карнейчука, вітаўшага юбіляраў ад імя совецкай інтэлігенцыі.

З адказным словам ад калектыва Мастацкага тэатра выступае народны артыст СССР В. І. Качалаў. Па яго прапанове ўсе прысутныя ўшанавалі ўставаннем памяць пакойнага асновапаложніка тэатра Канстанціна Сергеевіча Станіслаўскага. Некалькі мінут у зале панавала ўрачыстая цішыня.

Затым В. І. Качалаў па даручэнню мастацкага кіраўніка тэатра народнага артыста СССР В. І. Неміровіча-Данчэнка, які не мог выступіць у сувязі з фізічнай пераўтомленасцю, прачытаў яго прамову, падводзячую вынікі творчага жыцця Мастацкага тэатра за 40 год.

З велізарным уздымам і натхненнем народны артыст СССР Л. М. Леанідаў агаласіў зварот калектыва Мастацкага тэатра да таварыша Сталіна.

Усе прысутныя наладжваюць бурную авацыю ў гонар таварыша Сталіна.

Юбілейны вечар закончыўся выступленнямі віднейшых артыстаў краіны і актораў МХАТ.

ПІСЬМЕННІКІ-КОМСАМОЛЬЦЫ

*** АРКАДЗЬ КУЛЯШОЎ

Першыя паэтычныя вопыты А. Куляшова выпадаюць на годы 1929—1930. «Росквіт зямлі» і «Па песню, па сонца» — першыя яго зборнікі. Багрыцкі і Лугаўской (са значнай прымессю іншых уплываў) — першыя настаўнікі. Не абавязкова разглядаць раннія вершы Куляшова для таго, каб зразумець своеасаблівасць яго далейшага творчага развіцця. У гэтым і заключаецца асаблівасць паэта Куляшова, што ён заўсёды адчуваў неадольную патрэбнасць ламаць устаяўшуюся манеру пісьма, правяраць сябе на тэме, шукаць кожны раз новыя сродкі ўвасаблення. Справядлівасць патрабуе адзначыць, што ў няспынным руху Куляшова ёсць вельмі шмат ад яшчэ неўстаяўшайся індывідуальнасці, ад адсутнасці цвёрдай упэўненасці ў праваце сваіх паэтычных прынцыпаў. Для таго, каб стаць сапраўдным буйным майстрам паэзіі, Куляшову яшчэ ў вельмі вялікай меры нехапае сваёй унутранай пераконанасці, якая-б не ператварала кожную новую яго рэч у новы «перыяд» ці новую «старонку» творчага развіцця. Перад Куляшовым ставіцца задача знайсці сябе, знайсці сваю непаўторную чалавечую (а не толькі фармальна-паэтычную) індывідуальнасць, абагуліўшы ўсе тыя разрозненыя крупінкі асабістага вопыту, якія рассыпаны па асобных зборніках і кнігах паэта.

Прыгадаем раннія вершы Куляшова. Свет, разглядаемы вачмі семнаццацігадовага юнака, прывабнага ў сваёй юнацкай шчырай усхваляванасці, увасоблен у гэтых вершах. Куляшоў апяваў у іх сваё пакаленне людзей, якое вырасла пры савецкай уладзе як у нармальнай абстаноўцы. У гэтым апяванні шмат шчырага пачуцця і значна менш сапраўды лірычнай канкрэтнасці. Збіральны вобраз камсамольскага калектыва, да якога належыць і сам паэт, хутчэй пракламіраван, чым паэтычна раскрыт.

Лепшым вершам з кнігі «Па песню, па сонца» з'явіўся верш «Дарога», у якім асабісты, ледзь не дзённікавы запіс маладога паэта быў удала ўключан у больш шырокі грамадскі актыў; верш аб тым, як надыходзіць сталасць і адыходзіць маленства

Ад кошыкаў, ад стомы, ад вятроў...
Ад кошыкаў,
ў якіх мы носім плён,
Ад стомы, —
што ідзе пасля,
І ад вятроў, —
норд-остаў і зюйд-вестаў.

Невялікая кніга Куляшова была па-сапраўднаму паэтычна.

Кніга вершаў «Медзі дождж», паэмы «Аманал», «Гарбун», «Людзі прагнуць» — гэта куляшоўскі эпас. Ва ўсіх гэтых рэчах рос Куляшоў. Ён рабіў смелыя вопыты ў галіне верша, аналагічна тым, якія праводзіліся ў рускай паэзіі. Асваенне новых рытмаў, увядзенне празаізмаў, зварот да публіцыстычных элементаў у рамках агульна-эпічнага задання, — усё гэта сведчыла аб сур'ёзнай рабоце маладога паэта, авалодваўшага складанейшай паэтычнай культурай сучаснасці.

У цыкле вершаў «Сонечнае заўтра» (з кнігі «Медзі дождж») Куляшоў паказаў сутыкненне старога, патрыярхальнага ўкладу дакалгаснай вёскі з тым новым, што калектывізацыя ўнесла ў яе. Куляшову ўсё старое ўяўляецца ў суцэльна змрочных тонах. Наадварот, усё новае, што «ўрываецца з ячэйкай камсамольскай, з маладым пакаленнем гальштукаў чырвоных», мае яркія рамантычныя абрысы. Нам і зараз здаюцца цудоўнымі па сваёй свежасці вершы А. Куляшова з кнігі «Медзі дождж», у якіх паказан «апошні нехацімец», «першабытны чалавек з тарфяных балот», што пяе сумную песню і з прыкрасцю скардзіцца на адзіноту, альбо тыя вершы, у якіх цётка Вольга, угледзеўшы, як трактар ладзіць «рэвалюцыйны паход»,

Крычала на ўсе вуліцы,
Захлінаючыся ад бегатні да слёз:
— А мае-ж вы матулечкі,
Схапіў маю палоску і панёс.

У гэтых вершах было яшчэ шмат ад нарыса, спалучаемага з элементамі кніжнай рамантыкі («Попел, як пух савіны на рамантычным вогнішчы ўсплыў») але агулам цыкл вершаў «Сонечнае заўтра» трэба прызнаць цікавым творам маладога паэта аб незабыўных днях першых пяцігодак. Трэба адзначыць і паэму Куляшова «Крыўда» — аб імперыялістычнай вайне, аб ашуканых салдатах, якія пазналі ману пра бога і пра буржуазны лад. Шкада толькі, што ў гэтай паэме значнае паэтычнае майстэрства маладога паэта, яго бліскучае ўменне карыстацца прыватнай лірычнай дэталлю — падпарадкаваны заданню, якое палітычна недастаткова завострана (адсутнасць сувязі паміж паказам вайны і пытаннем падрыхтоўкі новых бойняў).

Наступныя паэмы Куляшова, — такія, як «Аманал», «Гарбун», «Людзі прагнуць», — здзіўлялі тым-жа рэзкім несупадзеннем паміж зусім канкрэтнай фактурай паэтычнага радка Куляшова і тым нерэалістычным, па сутнасці, заданнем, на якое паэт працаваў. Няправільна арыентаваны крытыкай, Куляшоў лічыў магчымым ствараць эпас без дастаткова ўважлівага і глыбокага вывучэння жыцця. І толькі «Васіль Баранаў» з'явіўся ў гэтых адносінах пераломным творам.

У гэтай паэме, прысвечанай жыццю і смерці героя-чырвонаармейца, загінуўшага ў палоне ў крывавых самураяў, не выдаўшы ніводнай тайны савецкай зямлі, Куляшоў, у адрозненне ад ранейшых сваіх паэм, палітычна канкрэтызаваў тэму і заданне рэчы. Уся паэма насычана духам савецкага патрыятызма. Гэта першая акалічнасць, якая ставіць «Васіля Баранава» значна вышэй такіх паэм, як «Гарбун» ці «Крыўда» (я ўжо не кажу пра «Аманал»). «Паэзія павінна мець поўны палітычны зарад» — гэта завяшчанне Маякоўскага. Куляшоў ажыццявіў у сваёй паэме аб Баранаве. Такія паэтычныя эпізоды паэмы, як заключны, калі падвержанаму жорсткім катаванням маладому савецкаму патрыёту з'яўляецца вобраз правадыра і правадыр выносіць Васіля, засынаючага пад удары вялікага сэрца, да родных снягоў, да родных абшараў, — з'яўляюцца эпізодамі вялікай уздзейнічаючай эмацыянальнай сілы, каштоўнай паэтычнай знаходкай Куляшова.

Другая перавага «Васіля Баранава» перад раннімі паэмамі Куляшова ў тым, што ў ёй паэту ўдалося надаць першыя жывыя абрысы людзям, удалося стварыць жывыя, а не выдуманыя людскія біяграфіі. Праўда, і ў рамках гэтай рэальнай біяграфіі цэнтральнага героя паэмы Баранава Куляшоў усё-ж паэтызуе «прыватнасці», «дапісвае» і «дапаўняе» жыццё героя пры дапамозе старых прыродных вобразаў.

Нарэшце, трэцяй і асноўнай вартасцю паэмы «Васіль Баранаў» з'яўляецца яе прастата, прышоўшая на змену ўяўнай ускладнёнасці, якой у свой час быў падвержан паэт. Паварот да Некрасава, вярней, уплыў Некрасава, які асабліва моцна сказаўся на будаванні верша, якім напісан «Васіль Баранаў», у гэтым сэнсе знамянальны і сімптаматычны. Паварот да традыцый класічнай паэзіі, да традыцый сапраўды народнай паэзіі ёсць адначасова і паварот да вялікай і добрай прастаты.

Да 20-годдзя слаўнага ленінска-сталінскага камсамола Куляшоў напісаў паэму «У зялёнай дуброве» і выдае кнігу вершаў «Мы жывем на граніцы».

Паэма «У зялёнай дуброве» ўваходзіць жывым, удалым аргументам у гушчу нашых спрэчак аб ілюстратыўнай літаратуры, якая на пытанні жыцця падрыхтавала сотні гатовых адказаў, што павінны ілюстрыраваць тую ці іншую «праблему», той ці іншы мысленны «тэзіс». І вось паэма Куляшова, нават пры ўсіх яе значных недахопах, уяўляе сабой той від мастацкай творчасці, які на практыцы абвяргае небяспечную хваробу ілюстратарства. Жыццё, апісваемае Куляшовым, жыццё новай калгаснай вёскі, не страціла ў паэме свайго непасрэднага паху і колеру. Людзі, паказаныя Куляшовым, трактарысты, брыгадзіры, звеннявыя авеяны дымкай добрай паэтычнасці і лірызма.

Вось ёлачка тая
Над ціхай мясцінай,
Дзе Першага мая
Ён стрэўся з Хрысцінай.

Людзі Куляшова свабодна адчуваюць сябе ў створаным імі свеце, яны самі твораць сваё шчасце і ўласны свой лёс. Яны па-сапраўднаму аптымістычныя, калі пад аптымізмам разумець не лёгкавеснае пачуццё, а глыбокую чалавечую якасць.

Куляшову можна паставіць у віну яшчэ недастатковае ўменне будаваць натуральны паэтычны сюжэт. Асобныя чалавечыя вобразы прыводзяцца толькі для таго, каб сяк-так звязаць урыўкі сюжэта, атрымліваючы як-бы ненарокам і пэўную ідэйную нагрузку. Усё гэта, вядома, зніжае значэнне паэмы «У зялёнай дуброве», як эпічнага твора. Гэта, хутчэй, разгорнуты верш аб людзях соцыялізма, верш, напісаны з добрым паэтычным пачуццём, цёпла і пранікнёна.

Дваццацігоддзе ленінска-сталінскага камсамола малады паэт-камсамолец А. Куляшоў сустракае вартым чынам.

Г. БЯРОЗКІН.

МАЛАДЫЯ МАЙСТРЫ МУЗЫЧНАГА ФРОНТА

Ускормленая і выпеставаная мацераю-радзімай, партыяй Леніна—Сталіна, савецкая моладзь атрымлівае ўсё для развіцця сваіх талентаў, здольнасцей і дараванняў, і няма ніводнага ўчастка нашага шматстайнага жыцця і работы, дзе-б не праявіліся гэтыя творчыя здольнасці савецкай моладзі, даўшай герояў, вучоных, стаханаўцаў, якімі ганарыцца ўся краіна.

Музыкальнае мастацтва Беларусі ў сваёй барацьбе з ворагамі народа, у сваім развіцці непарыўна звязана з дзейнасцю моладзі. Яна была смелым барацьбітом за вялікае мастацтва, яна ўносіла ў творчае жыццё новы, свежы, малады струмень. У творчай арганізацыі кампазітараў перадавая моладзь адна з першых павяла барацьбу з рапмаўшчынай, змагалася за сапраўдную, сур'ёзную вучобу, за стварэнне поўнацэннага мастацтва. Змагалася не толькі на словах, але і на справе, асабістым прыкладам, практычнай работай. Можна проста сказаць, што ў змяненні твару і характару дзейнасці Саюза кампазітараў маладзёжны актыў адыграў вядучую ролю. Беларускае музыкальнае мастацтва мае ў сучасны момант немалую сімфанічную, оперную, харавую і камерную літаратуру і сярод яе аўтараў у першых радах ідзе наша таленавітая моладзь: адзін з самых маладых — дэпутат Вярхоўнага Совета БССР А. Багатыроў і два камсамольцы-кампазітары тав. Падкавыраў і Папоў.

Багатыроў, аўтар сімфоніі, вакальна-сімфанічнай паэмы «Казка аб Мядзведзіце», раду камерных і харавых твораў, зараз скончыў змястоўную оперу «Дрыгва» — твор з бясспрэчнымі вялікімі вартасцямі, пастаноўка якога намячаецца трыма сталічнымі тэатрамі (Масква, Кіеў, Менск)

Цікавымі творчымі данымі валодае таленавіты кампазітар-камсамолец Падкавыраў. Сваю першую буйную работу — сімфонію ён прысвяціў ленінска-сталінскаму камсамолу, выхаваўшаму яго і даўшаму яму сапраўдную дарогу. Сімфонія пэўнай праграмы не мае, але яе музыкальны змест у цэлым і ў асобных дэталях расказвае аб камсамоле, яго маладосці, радасным жыцці, аб бадзёрым, упэўненым поступе. У сімфоніі шмат свежасці, ласкавасці і юнацкага задору. Падкавыраў вылучаецца і сваімі масавымі песнямі, большасць з іх — аб камсамоле і напісаны да юбілея. З рысамі масавай музыкальнай літаратуры, чоткія па рытму і руху, яны ў той-жа час арыгінальныя і яркія па меладычнай лініі і па акампаніменту. Зараз Падкавыраў пачаў работу над операй «Як гартавалася сталь» (паводле рамана Н. Астроўскага).

Малады кампазітар-камсамолец Папоў, займаючыся ў асноўным педагагічнай работай, выявіў сябе таксама здольным для сур'ёзнай творчай работы. Яго вакальная сюіта «Тры песні аб Радзіме» і рад камерных твораў і песень па думцы і прыёмах выражэння пераканальна гавораць аб гэтым.

За апошнія годы музыкальная культура Беларусі ўзбагацілася і маладымі выканаўчымі сіламі. Цудоўна ўзброеныя музыкальнымі ведамі, тэхнікай свайго інструмента, савецкім выканаўчым стылем, яны сваім творчым падыходам, удумлівасцю, маладым тэмпераментам, эмацыянальнасцю ствараюць запамінаючыяся выступленні і кладуць пачатак сур'ёзнай камернай і эстраднай канцэртнай рабоце. Піяністы Клумаў, Бергер, скрыпач Амітон — яркія прадстаўнікі маладых таленавітых выканаўцаў. Яны — маладыя дацэнты Кансерваторыі БССР, маладыя педагогі навучаючайся моладзі, выхоўваюць яе, перадаюць ёй свае веды, свой вопыт. Дацэнт Клумаў праяўляе сябе і як здольны і цікавы кампазітар. Вялікай увагі заслугоўваюць яго фартэп'янныя творы — першыя ластаўкі эстраднафартэп'яннага жанра, высокага па якасці, віртуознага па тэхніцы і лёгкадаступнага па ўспрыняццю. Безумоўна ўдаліся Клумаву і яго песні, прысвечаныя камсамольскаму юбілею («Буй вецер», «Я сын працоўнага народа»). Свежыя, напеўна-выразныя і своеасаблівыя, яны адразу-ж узбудзілі да сябе заслужаную цікавасць.

Таленавітая моладзь расце і цудоўна праяўляе сябе і сярод студэнцтва Кансерваторыі і ў калектыве Тэатра оперы і балета, дзе многія сваімі здольнасцямі, сваёй работай занялі месца вядучых артыстаў, карыстаючыхся любоўю савецкага гледача.

Сталінскія словы «авалодаць навукай, выкоўваць кадры большэвікоў — спецыялістаў па ўсіх галінах ведаў» цвёрда засвоены нашай моладдзю. Любоў і клопаты правадыра, партыі і ўрада, усяго народа стварылі для яе той шчаслівы час, калі яна радасна творыць і працуе, упэўненая ў сябе, у сваю будучыню, у будучыню сваёй вялікай маці-радзімы. **Н. ШЧЭГЛОЎ.**



НА ЗДЫМКУ (злева направа): — дэпутат Вярхоўнага Совета БССР кампазітар А. Багатыроў, кампазітар-камсамолец П. Падкавыраў, дырэктар Дзяржаўнай беларускай кансерваторыі М. Бергер, кампазітар А. Клумаў.

Фота І. Каплінскага

500 РАБОТ МАСТАКОЎ-САМАВУЧАК

Беларускі Дом народнай творчасці атрымаў шматлікія экспанаты для ўсебеларускай выстаўкі народнай творчасці, якая адкрылася ў Менску ў гонар 20-годдзя ВЛКСМ і XXI гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі. Мастакі-самавучкі, скульптары, рэзчыкі па дрэву, майстры мастацкай вышыўкі і ткацтва з калгасаў, школ, з прадпрыемстваў розных раёнаў рэспублікі прыслалі для выстаўкі больш 500 работ.

ЧЫРВОНАСЦЯЖНЫ КОМСАМОЛ

ПАЭМА

1.

На прадпрыемствах, па франтах,
Па дымных хатах бедных сёл —
Твой пачынаўся слаўны шлях,
Чырвонасцяжны комсамол!
Ты помніш гоман барыкад,
Страі рабочых юнакоў...
Стаяў чырвоны Петраград,
Са ўсіх акружаны бакоў
Варожай сілай.
Помніш той,
На смерць задуманы паход...
Кастрычніку быў блізка год.
За роднай партыяй сваёй
Тады устаў на бой народ
Супроць паноў.
Там голас твой
Нязломны вырас у баях.
Няхай жыве твой слаўны шлях,
Чырвонасцяжны комсамол!
Хай песня мужная вакол
Разносіць славу па палях,
Па акіянах, па марах,
Па буйных, гулкіх гарадах —
Як ты ўзнімаўся, узрастаў
І ў бой за партыяй хадзіў,
Як мудрасць Леніна пазнаў,
Як думкай Сталіна расцвіў,
Як словы Леніна ты нёс
У сэрцы полымным сваім
І словам Сталіна узрос
Ты непахісным, баявым,
Як для радзімы маладой
Бранёю стаў ты і красой,
Як нетры выведаў зямлі,
Павёў праз хвалі караблі,
Як пакараў вяршыні гор,
Як пільна ты нясеш дазор
І ўвысь узняўся, што арол —
Чырвонасцяжны комсамол!

2.

Па стэпах зялёных ідуць эшалоны —
Там рокат шрапнельны свінца,
Распісаны фарбай старыя вагоны
Рукой комсамольца-байца.

Ён рос ля задымленых сцен
Петраграда,
Дзе трубы ўздымае завод,
Ён зведаў жыццё баявога
Кранштата
І хвалі успененых вод;

Спаткаў рэволюцыю ён на лінкоры —
Было яму дваццаць гадоў.
Валы узнімала Балтыйскае мора
Пад самую чырвань сцягоў.

Калі пад Царыцын, ахутаны дымам,
Зваў моладзь вялікі Ільіч, —
Ішоў комсамолец пад сцяг твой,
радзіма,
На ленінска-сталінскі кліч.

Ідуць эшалоны па стэпах зялёных,
Калышацца травамі дол.
Распісаны фарбай старыя вагоны:
«На фронт, малады комсамол!»

Ідуць комсамольцы, рабочая моладзь
З кварталаў фабрычнай Масквы,
З лясоў беларускіх, і весак, і сёлаў,
На поўдзень, на фронт баявы.

Там Сталін мацуе рэспублікі сілы,
Царыцын — Советаў аплот,
Там слёсар луганскі Клімент
Варашылаў
Палкі падымае ў паход.

І едзе баец петраградскі чырвоны
На грозны царыцынскі фронт.
Запоўнены цесна платформы,
вагоны...
Страчай комсамольцаў, народ!

Шумяць кавылі і цвітуць медуніцы
Ля чорных яроў, бліндажэй.
Грымяць кананады. І хлебны Царыцын
Склікае на штурмы людзей.

У самай суровай смяртэльнай атацы,
Як пыл па-над стэпам знікаў,
Не стала байца, камандзіра,
кранштадца,
Любімца, сябра, мастака.

Грукочуць вагоны ў яго размалёўцы.
Паслаўся высокі кавыль.
На помсту на ворага йдуць
комсамольцы
Баку, Петраграда, Масквы.

Ты з партыяй быў — і ў глыбокім
падполлі,
У бойках — і ў спёку, і ў золь.
Суровыя песні пяюць аб Трыполлі,
Там слава твая, комсамол.

Бясстрашных герояў сваіх памятае
Царыцын, Уфа і Орол
Там нашы дзяўчаты шагалі франтамі,
Там слава твая, комсамол.

У вяках прагрымелі баі Перакопа,
Там ясныя ўзняў ты сцягі,
З пуцёўкамі Трэцяга З'езда ў акопы
Ішоў, комсамол дарагі.

Табе комунізма свяцілі зарніцы
І Ленін паказваў шляхі,
З наказам:

вучыцца,
вучыцца,
вучыцца
Ішоў, комсамол дарагі.

Радзіма!
Уславім бясстрашных герояў,
Што палі ў суровым баю.
Жыццё аддавалі яны дарагое
За родную нашу зямлю;

За тое, каб густа рунелі усходы,
Заводы, мартэны раслі,
За тое, каб шчасна спявалі народы,
Пад сталінскім сонцам жылі.

Франты адгрымелі.
Разгромлены вораг.
Па стэпах вятры шалясцяць.
Высока і горда узвіўся ў прасторах
Наш ленінска-сталінскі сцяг.

3.

Памёр Ільіч. Мы ўсе сышліся
Каля труны яго ў той час,
І словы Сталіна ўзняліся
Магутнай клятвай сярод нас.

Прад схіленым жалобным сцягам
Ён клятву даў за ўвесь народ —
Наперад крочыць верным шляхам
І не баяцца перашкод.

— Клянемся! — грозная клятвы слова
Ішло на шахту, на завод;
— Клянемся! — паўтараў сурова
За партыяй увесь народ.

— Клянемся! — цвёрдай клятвы слова
Ішло да зацішных сёл;
— Клянемся! — паўтараў сурова
З народам разам комсамол.

А мы, — што ў нашы дні ўступілі
У комсамольскія рады, —
З чырвоным гальштукам хадзілі
У тыя мужныя гады.

Мы ў кажушках ішлі снягамі,
Быў перад намі белы дол —
І нашы маткі разам з намі
Ішлі да нашых сумных школ.

І клятва нас да слёз праймала,
І мы ёй вернымі былі
Ад Менска да снягоў Байкала
Па ўсёй зямлі, па ўсёй зямлі.

А сёння пакаленне наша
Выходзіць з песняй баявой,
Усюды мы — на горных пашах,
У гулкіх шахтах пад зямлёй.

Мы будаўнічыя брыгады
З чырвонай гвардыі метро,
Нам нетры горныя падўладны
І ў іх схаванае дабро.

Мы чуем полюса дыханне
І гул арктычнае зімы.
Як пахне ў восеньскае ранне
Даспелы яблык — знаем мы.

Ад хваль, што пеняцца вільготна,
На вуснах нашых пыл марскі,
Мы падымаем скарб падводны,
Які на дне ляжаў вякі.

Вядзем камбайны мы ў зажынкі
Пад гоман адзіўленых дзядоў;
Сухое зерне — без расінкі —
Ссыпаем ў кузаў з бункероў.

І знае ўвесь Саюз вялікі,
Урал, Макееўка, Кузбас,
Што ў нас стаханаўскія рукі —
Што воля сталінская — ў нас.

У нас — надзейная дарога,
Нам мэты ясныя відны,
Мы — нашай партыі падмога,
Мы — нашай партыі сыны.

Як небасхіл зацьміцца дымам
І кліч прамчыцца аб вайне,
Спытае ў нас тады радзіма:
— Вы не забылі клятву?
— Не!

— Мы помнім клятву! — гэтак скажам
Радзіме любай у адказ,
І з ворагам смяротным нашым
Сустрэнемся ў апошні раз.

Сталёвай лавай танкі хлынуць
На фашыстоўскі дзікі зброд,
І мёртвую пятлю накіне
На горла ворага пілот.

Нястомная будзе наша сіла
Пад баявым агнём зарніц.
Як Фрунзе, Шчорс і Варашылаў
Радзіму будзем бараніць.

4.

Цішыня. На небе ўсходзяць зоры
І глядзяць у сінія вазёры.
Ноч ідзе праз горы, праз лясы,
Поўная асенняе красы.

Спіць зямля, любімая такая, —
Сніць аб новых, слаўных ураджаях.
Нам багата прынясла яна
Налiўнога, чыстага зярна —

Да краёў напоўненыя клеці.
У збаны крыніца мёду ллецца.
Залатыя, спелыя плады
Дораць нам калгасныя сады.

Дзесьці ллецца песня маладая:
— Дадзена нам юнасць залатая.
— Мы жывем у самы светлы час,
Узрасціў любімы Сталін нас.

Спяць у хатах у прасторных дзеці,
Самыя шчаслівыя на свеце.
Мірны сон вам, любыя, й спакой!
Жыць як добра на зямлі такой!

Ноч ідзе праз пушчы і вазёры,
Праз тайгу, і сопкі, і праз горы.
Клёны маладыя не шумяць,
Цішыня... А ля граніц не спяць.

У снягах Карэліі суровай,
На халодным возеры Хасан
Ці за Менскам у лясах сасновых, —
У пургу,
і холад,
і туман, —

Берагуць адважныя героі
Гарадоў і ніў спакойных шыр,
Кожны міг гатовыя да бою
За зямлю савецкую,
за мір!

Ля Кранштата, дзе сінее мора,
Хваля залівае берагі, —
Там стаяць у сталінскім дазоры
Нашы комсамольцы-маракі.

Над абшарам, над маўклівым полем
Загудзеў вясёла самалёт.
Ярка зоры свецяць.
Комсамолец
У начны збіраецца палёт.

Скачуць стэпам баявыя коні
Ля шырокага Дняпра-ракі,
Калі трэба — стануць на кардоне
Грозныя казацкія палкі.

Нам бацькі крывёю здабывалі
Кожную жывую пядзь зямлі.
Нам бацькі навечна наказалі,
Каб яе нікому не здалі.

І заўсёды мы шануем строга
Усё, што нам наказвалі яны.
Мы — вялікай партыі падмога,
Сталіна вялікага сыны.

Хай не лезуць галаўё-бандыты,
Не ўзнімаюць брудную руку!
Рубяжы савецкія закрыты —
На магутным, на стальным замку.

Шчасце наша, маладосць і славу
Мы жыццём гатовы адстаяць,
Па марах,
у небе,
на заставах
Верныя Міхеевы стаяць.

Твой спакой, радзіма дарагая,
Як зяніцу вока беражом!..
Мы цябе грудзьмі абараняем,
Хай жыве наш сталінец Ежоў!

Ноч плыве.
Спяць дзеці у спакоі.
Ясны сон вам, любыя, і мір!
Цішыня... А мы гатовы к бою
За жыццё,
за Сталіна,
за мір!

Эдзі АГНЯЦВЕТ, Пятрусь БРОЎКА, Міхась КАЛАЧЫНСКІ, Аркадзь КУЛЯШОЎ, Пімен ПАНЧАНКА, Аляксандр ШАРАПАЎ.

III УСЕБЕЛАРУСКАЯ АЛІМПІЯДА МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ

27 кастрычніка ў клубе імя Сталіна ва ўрачыстай абстаноўцы адкрылася III Усебеларуская алімпіяда мастацкай самадзейнасці, прысвечаная XX-годдзю ленінска-сталінскага камсамола і XXI гадавіне вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

Першы вечар алімпіяды пачаўся выступленнем раду лепшых калектываў самадзейнасці ўсіх абласцей (хор Асінторфа, танцавальныя калектывы віцебскага клуба «Кастрычнік» і менскага клуба дзяржгандлю, джаз менскай фабрыкі «Кастрычнік», цыганскі танцавальны калектыў калгаса імя Карла Маркса Полацкага раёна) і многіх салістаў: Шабашовай (мастацкае чытанне), Гарохавай (частушкі), Кушнера, Махліна, Шоўмана і інш.

Адначасова ў клубе металістаў выступалі іншыя калектывы самадзейнасці, з якіх трэба адзначыць хор пад кіраўніцтвам калгасніцы Лапацінай (Рэчыцкі раён), ансамбль песні і пляскі, калектыў цымбалістаў і танцавальную групу цыганаў менскага клуба будаўнікоў і рад салістаў: балалаечніка Маркава, Ціханаву (спевы), Сізова (чытаў уласныя вершы), васьмідзесяцігадовага Новікава (сола на жалейцы), сямідзесягадовага Сяргеенка (украінскі гапак), Валю Мухарову (пластычны эцюд) і інш.

28 кастрычніка ў клубе імя Сталіна прадаўжаўся паказ самадзейнасці Віцебскай і Гомельскай абласцей. Шмат выдатных узораў самадзейнасці прадставіў гомельскі чыгуначны клуб імя Леніна (танцавальныя групы дарослых і дзяцей, ансамбль цымбалістаў, гарманіст Курбатаў). Добрую ацэнку выклікалі выступленні хора Казловіцкага сельсовета Слуцкага раёна, старух-калгасніц Галец і Якімовіч (беларускія песні), члена арцелі «Ударнік» Слуцкага раёна Казлоўскай (спевы), работніцы гомельскай арцелі «Прагрэс» Нікалаевай (спевы), домрабалалаечнага аркестра Гомельскага педінстытута, Фігліна (мастацкі свіст), танцавальнага калектыва жлобінскага чыгуначнага клуба і інш.

Адначасова ў клубе металістаў ішоў паказ драматычнага жанру. Былі пастаўлены вадэвіль «Мядзведзь» Чэхава ў выкананні калектыва віцебскага чыгуначнага клуба, той-жа вадэвіль у выкананні калектыва магілёўскай шоўкавай фабрыкі, дзве карціны з п'есы Гусева «Слава» у выкананні Горацкага інстытута, п'еса «Капрызная амерыканка» у выкананні калектыва крычаўскага цэментнага завода.

29 кастрычніка ў клубе імя Сталіна прадаўжаўся агляд мастацкай самадзейнасці. Выступалі калектывы Магілёўскай і Палескай абласцей. У клубе металістаў прадаўжаліся выступленні драматычных калектываў.

Сёння ў клубе імя Сталіна адбудзецца прагляд самадзейнасці Менскай вобласці і фінальны паказ лепшых калектываў і салістаў БССР.

На алімпіядзе прысутнічаюць прадстаўнікі Масквы, Ленінграда, Кіева, Днепрапетроўска і гор. Сталіно.

ПЕСНІ ПРА РАДАСЦЬ І ШЧАСЦЕ

Усебеларуская алімпіяда самадзейнага мастацтва, якая адкрылася 27 кастрычніка,—яркая дэманстрацыя шчаслівага і вясёлага жыцця нашага народа, росквіту талентаў і народнай мастацкай творчасці.

Харавыя песні, народныя танцы, якія выконваліся на алімпіядзе ў клубе металістаў 27 кастрычніка, прасякнуты аптымізмам і жыццерадаснасцю. Аб радасным калгасным жыцці, аб родным і любімым Сталіне спявалі хор калгаса імя Літвінава Рэчыцкага раёна і калгасны хор Бягомльскага раёна. У песнях калгаснікаў і калгасніц—цеплыня, задушэўнасць і надзвычайная музыкальнасць.

Народныя танцы «Крыжачок», «Юрачка», «Бульба», «Мяцеліца» ў выкананні танцавальных калектываў гомельскага клуба чыгуначнікаў і менскіх клубаў будаўнікоў і металістаў узбагачаны новымі яркімі фарбамі.

Громам воплескаў сустрэлі прысутныя выступленне 75-гадовага калгасніка Сяргеенка, які з юнацкім запалам станцаваў украінскага гапака.

З вялікім пачуццём выканаў на жалейцы народныя танцы «Казачок», «Полечку» і «Крыжачок» 80-гадовы калгаснік Віцебскай вобласці т. Новікаў.

На алімпіядзе выступалі і чытальнікі мастацкіх твораў. Шофер Сізоў чытаў уласныя вершы аб героях нашай радзімы і на інтымна-лірычныя тэмы. Тав. Ермакоў (Гомель) з мастацкім густам прачытаў «Радыстку» Далматоўскага.

На праглядзе ў клубе металістаў амаль адсутнічаў інструментальны жанр, за выключэннем балалайкі, на якой Маркаў (Віцебская вобласць) іграў «Чардаш» Монці і «Венгерскі танец» Брамса.

А. МАЙСЕЕЎ.

ДЭМАНСТРАЦЫЯ НАРОДНЫХ ТАЛЕНТАЎ

«Слово сталинское с нами,
Воля сталинская в нас!»

Гэтымі словамі, песняй аб правадыру і другу народаў неабсяжнай савецкай краіны адкрылася трэцяя Усебеларуская алімпіяда мастацкай самадзейнасці—яркая і маляўнічая дэманстрацыя талентаў шчаслівых свабодных людзей, творчыя здольнасці якіх квітнеюць і спеюць пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі. Сярод паўтаратысячнай арміі ўдзельнікаў алімпіяды—лепшых прадстаўнікоў самадзейнасці—шмат новых, яшчэ незнаёмых нам калектываў і шмат такіх, якіх бачылі на ранейшых праходзіўшых алімпіядах. Але і старыя калектывы змянілі свой твар, пасаліднелі, папоўніліся, абнавілі свой рэпертуар, сталі мацнейшымі, больш вопытнымі і ўпэўненымі.

Па шматстайнасці жанраў, па разнастайнасці выканаўцаў трэцяя Усебеларуская алімпіяда абяцае быць надзвычай цікавым і маляўнічым відовішчам.

У дзень адкрыцця выступілі калектывы і асобныя выканаўцы Оршы, Віцебска, Чачэрска, Дрысы, Рагачова, Полацка, Гомеля і Менска. Найбольш паспяховымі былі выступленні калектыва Асінторфа (Орша), паказаўшыя, што выканаўцы здольны авалодаць рознымі жанрамі мастацтва, акрабатычныя і танцавальныя групы Віцебска, танцавальны калектыў клуба дзяржгандлю (Менск), джаз менскай фабрыкі «Кастрычнік», жаночы хор віцебскага клуба дзяржгандлю, які паказаў добрую гучнасць, зладжанасць і выразнасць выканання. Асабліва хочацца адзначыць яркае выступленне калгаса імя К. Маркса (Полацк)—характэрныя, стыльныя цыганскія пляскі, адзіўляючыя сваёй тэхнікай, утончанасцю, багатай рытмікай, жывасцю.

Цікавыя выступленні і ў раду асобных выканаўцаў. Характэрны фальклорны дуэт беларускіх калгаснікаў Стася і Усцінава на дудах, музыкальнае і выразнае выкананне класічнага рэпертуару скрыпачом Дрэбушэўскім (Чачэрскі раён), добрая цыганская пляска рабочага Махліна (Віцебск), частушкі ў выкананні Гарохавай (Асінторф), выкананне яўрэйскіх песень Сапожнікавай (Віцебск).

Удалы і шматабяцаючы пачатак прагляду быў цёпла сустрэт гледачом. Савецкая грамадскасць з неаслабнай увагай сочыць за далейшым ходам алімпіяды.

Кампазітар Н. ШЧЭГЛОЎ.



НА ЗДЫМКУ (злева направа): — артыст Тэатра юнага гледача Л. Фрыдман, артысты Беларускага дзяржаўнага тэатра оперы і балета С. Драчын, прыма-балерына З. Васільева і А. Петрашкевіч.

ТЭАТР ШЧАСЛІВАГА ЮНАЦТВА

Тэатр юнага гледача складаецца пераважна з моладзі, выхаванай савецкай уладай і ленінскім камсамолам.

Тэатр пачаў сваю творчую работу ў мінулым годзе з п'есы «Як гартавалася сталь», напісанай па аднайменнаму твору слаўнага сына комуністычнай партыі і ленінска - сталінскага камсамола Н. Астроўскага. Гэта пудоўная кніга таленавітага пісьменніка-большэвіка глыбока ўсхвалявала і захапіла наш малады калектыў. Паказаць любімага героя нашага часу Паўла Карчагіна на сцэне — пачэсная задача.

Зараз у нашым рэпертуары, апрача п'есы «Як гартавалася сталь», яшчэ пяць новых спектакляў.

У дні свята тэатр пакажа свайму гледачу новы спектакль «Годы выпрабаванняў» Е. Раймонд. Гэта спектакль пра мужную гераічную барацьбу германскага народа з крывавым гітлераўскім фашызмам, спектакль пра лепшых сыноў Германіі, комуністаў і камсамольцаў, вядучых у глыбокім падполлі цяжкую барацьбу з фашысцкай рэакцыяй за свабодную Германію. Паставіў гэты спектакль заслужаны артыст БССР Е. А. Міровіч, рэжысёр—камсамолец Ю. Г. Палічынецкі.

Тэатр выхаваў у сваім калектыве шмат маладых творчых работнікаў.

Плённа працуе рэжысёр - камсамолец Юрый Палічынецкі. Дзесяцігадовым хлапчуком Юрый страціў сваіх бацькоў, якія былі закатаваны ў часе пагрому петлюраўскімі бандытамі. Быў беспрытульным. Тры гады «гастраліраваў» ад адной станцыі да другой. «Гастролі» гэтыя былі спынены ў 1923 годзе куйбышэўскім дзіцячым домам, які адчыніў перад ім дзверы ў новае жыццё.

Юрыю былі прапанаваны ўсе прафесіі, якія яго цікавілі. Не доўга раздумваючы, новы вучань затрымаўся на сталярнай справе. Скончыўшы прафшколу будаўнікоў, Юрый Палічынецкі разам з сябрамі паступае на куйбышэўскі дрэваапрацоўчы завод. Прыкмеціўшы ў свайго сябра «схаваны талент», камсамольская арганізацыя вылучае Палічынецкага на работу па арганізацыі самадзейнасці. Хутка драмгурток, якім кіраваў Юрый, стаў лепшым у горадзе. Убачыўшы сапраўдныя здольнасці маладога самадзейнага рэжысёра, гарком ЛКСМ гор. Куйбышэва накіроўвае Палічынецкага ў Маскоўскі тэатральны інстытут, які ён скончыў на «добра» ў 1936 годзе па класу народнага артыста СССР ордэнаносца Тарханава.

З 1936 года тав. Палічынецкі працуе ў БССР у Тэатры рабочай моладзі, а затым у Тэатры юнага гледача. Тут актыўны камсамолец, сакратар камітэта Ю. Г. Палічынецкі паказвае сябе як таленавіты цікавы рэжысёр. Яго пастаноўкі «Наша зброя», «Таямнічы востраў», «Як гартавалася сталь» (пастаўлена сумесна з Е. А. Міровічам) карыстаюцца заслужаным поспехам у нашага гледача.

Галоўнай рысай у творчай рабоце рэжысёра Палічынецкага з'яўляецца глыбокае вывучэнне матэрыялу, над якім ён працуе. Сваім творчым энтузіязмам Ю. Г. Палічынецкі натхняе актораў і накіроўвае іх па правільнаму творчаму шляху. Упартасць, страснасць і скромнасць — вось што характарызуе Ю. Г. Палічынецкага як камсамольца і рэжысёра.

Камсамолец - актор тав. Л. Фрыдман прыходзіць да свята з такімі ролямі, як Павел Карчагін у пастаноўцы «Як гартавалася сталь», Герцаг — «Наша зброя», Стакоўскі — «Ноч у верасні», германскі камсамолец Курт у спектаклі «Годы выпрабаванняў».

Запамінаючыяся вобразы стварылі і іншыя маладыя акторы тэатра: С. Гурвіч — ролю Ніны ў спектаклі «Ноч у верасні» і Люсі ў спектаклі «Наша зброя», актор Матусевіч — ролю Зайкі ў «Ноч у верасні», Вайнштэйн — ролю дыверсанта ў «Нашай зброі», Чэмелаў — ролю Сцяпана ў «Ноч у верасні», Цімафеева — ролю Валі ў спектаклі «Ноч у верасні», Савіцкі — ролю Сярожы ў спектаклі «Як гартавалася сталь» і інш.

Вялікую работу вядзе камсамольская арганізацыя і ўвесь калектыў тэатра па аказанню дапамогі самадзейнаму мастацтву гор. Менска.

Заслужаны артыст БССР Е. А. Міровіч і рэжысёр Палічынецкі па закліку дэпутатаў Вярхоўнага Совета СССР і РСФСР народных артыстаў І. М. Масквіна і Барсавай узялі сталае шэфства над двума самадзейнымі калектывамі гор. Менска — Палаца піянераў і фабрыкі імя Куйбышэва.

У самы бліжэйшы час тэатр павінен вырашыць новыя адказныя задачы. Першая з іх — стварэнне спектакля пра шчаслівае і радаснае жыццё нашай моладзі і школьнікаў, пра слаўныя гераічныя дні ленінска-сталінскага камсамола.

Тэатр павінен стварыць спектакль пра юнацтва самага дарагога і любімага чалавека працоўных усяго свету, друга і бацькі савецкага народа — пра Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна.

Трэба ўзмацніць сувязь са сваім гледачом — піянерамі, школьнікамі і моладдзю, з самадзейнымі драмгурткамі, узбагачаючы акторскі склад тэатра за лік таленавітай моладзі.

В. СТЭЛЬМАХ.

МАЛАДЫЯ СІЛЫ МАСТАЦТВА

У працягнуўшымся антракце спектакля «Тоска» мы вялі сяброўскую гутарку з Сімай Драчыным—маладым прэм'ерам беларускага балета. Што захапляе і хвалюе таленавітага артыста-камсамольца? Якія думкі апаноўваюць яго ў вялікія радасныя дні дваццацігоддзя ленінска-сталінскага камсамола?

Сіма Драчын гаворыць з запалам. Ён зачараван выдатнай ігрой савецкай балерыны Галіны Уланавай і танцоўшчыка Сяргеева. Драчын, скромна і строга-крытычна ацэньваючы сваю ўласную творчасць, старанна жадае вучыцца, авалодваць вышынямі савецкага балетнага мастацтва, быць такім, як Уланава, Сяргееў, як лепшыя майстры нашага балета.

Драчын марыць аб выкананні партыі мужнага сына гераічнага савецкага народа ў класічным савецкім балеце. Ён упэўнен, што нашы кампазітары створаць балеты, якія будуць такімі-ж сімфанічнымі і драматычнымі, як балеты Чайкоўскага, а іх сюжэты і вобразы будуць самымі найсучаснымі і эпохіяльнымі. Артыст апавядае пра свой параўнальна невялікі, але вельмі павучальны творчы шлях. Пасля эпізадычных танцаў у «Чырвоным маку» Р. Гліера, якія былі яго першымі танцавальнымі эцюдамі, Драчын выконваў партыю салдата Франца ў «Капеліі» Даліба. Артыст з удзячнасцю ўспамінае балетмейстара Ф. Лапухова, які дапамог маладому танцоўшчыку знайсці цёплыя фарбы, праўдзівыя і шчырыя рысы ў вобразе. Ён ускладае вялікія надзеі на новую сумесную работу з Лапуховым над балетам «Салавей» Крошнера.

Псеўданародны балет «Канёк-гарбунок» «балетмахера» Пуні не ўзбагаціў творчай біяграфіі артыста. Ні «музыка для ног», ні эклектычны «творчы метад» пастаноўшчыка спектакля Крамарэўскага не маглі задаволіць Драчына. Калі што-небудзь добрае і засталося ва ўспамін ад спектакля то гэта толькі выкананая артыстам варыяцыя на музыку «Салавей» Аляб'ева.

Казачны і рамантычны прынц Зігфрыд («Лебядзінае возера») сваёй сімфанічнай і псіхалагічна пранікнёнай мелодыкай даўно вабіў маладога артыста, выхаванага ў сям'і музыканта, у абкружэнні музычных гукаў. У вобразе Зігфрыда Драчын перш за ўсё шукае чалавека вялікіх пачуццяў і глыбокага драматызма. Мы згодны з Драчыным, што партыя Зігфрыда ім яшчэ поўнасцю недапрацавана. Мы ўпэўнены, што творчая нездаволенасць ужо зробленай вялікай работай над вобразам дапаможа артысту знайсці яшчэ новыя фарбы і нюансы. Далейшыя творчыя пошукі дапамогуць знайсці «скразную дзею» вобраза. Партыя Зігфрыда стане сапраўднай творчай удачай артыста.

Драчын захоплен новай работай над партыяй хана Гірэя ў «Бахчысарайскім фантане». Створаны геніяльным Пушкіным і таленавітым савецкім кампазітарам Асаф'евым вобраз адкрывае новыя творчыя перспектывы перад маладым артыстам. У паэмах і лірыцы Пушкіна Драчын шукае і знаходзіць адказы на хвалюючыя яго творчую фантазію пытанні.

Поўны энергіі і творчых шуканняў танцоўшчык Драчын не з'яўляецца выключнай адзінкай. Уся моладзь балета жыве актыўным творчым жыццём.

Прыма-балерына тэатра, маладая артыстка Зіна Васільева навучалася ў лепшай у свеце харэаграфічнай навучальнай установе—Ленінградскім балетным вучылішчы. Зіна Васільева—выдатны майстар балетнай класікі. На сцэне Ленінградскага опернага тэатра і Вялікага тэатра Саюза ССР расквітнеў яе талент. Простая і чароўная дзяўчына Сванільда («Капелія»), сялянка Ліза («Марная перасцярога»), Казачная і паэтычная Одэтта («Лебядзінае возера») знайшлі высокую ацэнку ў вядомых крытыкаў і майстроў мастацтва — балетмейстара Захарава, крытыкаў Солерцінскага і Івінга.

Уласцівасць артысткі — велізарная працаздольнасць і адданасць мастацтву балета. Самая любімая тэма гутаркі Васільевай—гэта балетная школа, мастацкім кіраўніком якой яна з'яўляецца. Аб выхаванцах школы Васільева гаворыць заўсёды.

Выхаванню будучых культурных і адароных артыстаў савецкага балета Васільева аддае ўсе свае веды і майстэрства. З такім-жа запалам і адданасцю яна выхоўвае салістаў і салістак балета. Вучыцца ў Васільевай—жаданне кожнай маладой артысткі. Пра гэта нам гаварыла дзевятнаццацігадовая артыстка Марыя Сцепанец. Гэта можна пачуць і ад іншых маладых таварышоў.

Ёсць у балеце вельмі скромны і задумены юнак—камсамолец Анатоль Петрашкевіч. За ветлай і лагоднай усмешкай Петрашкевіча захоўваецца чулы тэмпераментны таварыш, артыстычныя здольнасці якога яшчэ поўнасцю не раскрыты. Характэрны танец «з мечам» у балеце «Канёк-гарбунок» і асабліва класічнае па-дэ-труа (танец трох) у «Лебядзіным возеры»—паказчыкі росквіту таленту Петрашкевіча і вялікіх нескарыстаных яшчэ яго магчымасцей.

Моладзь—сэрца і душа балетнага калектыва Беларускага тэатра оперы і балета. Абаяльнасць балетных спектакляў, пры ўсёй іх часам мастацкай недасканаласці, у жыццёрадаснасці асноўнай масы выканаўцаў.

У ліку лепшых артыстак—камсамолкі салісткі О. Даронiна і Саушкіна, салісткі Багданава і Брызгалава, артысткі Залівака і Беляновіч і рад іншых здольных юнакоў і дзяўчат. Глядач не можа застацца раўнадушным да тэмпераментнага чардаша Багдававай, да яе чароўнай нявесты ў «Лебядзіным возеры».

Савецкая балетная моладзь сваё майстэрства цалкам аддае на службу нашаму вялікаму народу, сынамі і дочкамі якога яны з'яўляюцца.

Дваццацігоддзе ленінска-сталінскага камсамола таленавітая балетная моладзь сустракае з поўнай творчай энергіяй і жаданнем ствараць савецкае класічнае балетнае мастацтва і вобразы выдатных людзей эпохі вялікага Сталіна.

М. МОДЭЛЬ.

ЛІТАРАТУРНЫЯ ПАРАСТКІ

Ачышчаючыся ад варожых элементаў, беларуская літаратура расце і якасна і колькасна. Бясспрэчным паказчыкам гэтага росту з'яўляецца літаратурная моладзь — здольная, дапытлівая, удумлівая. Безумоўна, што ачышчэнне літаратурных радоў памагае творчаму росту старых пісьменнікаў і паяўленню ў літаратуры новых імёнаў, яшчэ ўчора нікому невядомых. Яно падштурхнула работу з пачынаючымі і маладымі аўтарамі, зусім рэальным вынікам чаго з'явілася прыняцце ў бягучым годзе ў рады Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР некалькіх найбольш здольных і зарэкамендаваўшых сябе творча маладых таварышоў, сярод якіх два празаікі—Усевалад Краўчанка і Уладзімір Кандраценя.

Усевалад Краўчанка, сын вясковага настаўніка, з замілаванасцю апісвае вясковае жыццё. Малюнкі, намаляваныя ім, з большага арыгінальныя і свежыя. Змяшчаюцца яны літаральна на некалькіх старонках. Бадай, заўсёды пачынаюцца яны натуральна проста і таксама натуральна проста канчаюцца. Але, не зважаючы на гэта, яны не пустыя і чытач з цікавасцю сочыць за развіццём сюжэта. У двух кніжках і ў перыёдыцы Краўчанка ён надрукаваў дзесяткі паўтары апавяданняў. Будова іх звычайная, дзея пачынаецца і адбываецца заўсёды ў абстаноўцы калгаснай штодзённасці. Вось апавяданне «Радасць».

Калгасны хлапчук, вясковы паштар Грышка, спыняецца перад варотамі новай хаты цёткі Хрысціны. Тыдні з два перад тым цётка Хрысціна добра пачаставала яго смачнымі варэнікамі за прынесеную ім паштоўку ад сына. А сёння-ж у яго тэрміновы ліст. Хрысціна непісьменная і таму Грышка чытае ёй ліст. Адзіны яе сын лётчык піша, што скончыў школу на «выдатна» і накіроўваецца паводле задания ў палёт. Маршрут пралягае над яго роднай мясцовасцю. І ён папрасіў дазволу апусціцца каля вёскі, каб праведаць маці. Наступнага дня ўвесь калгас сустракаў лётчыка За шырокімі сталамі была гамана, падымалі чаркі за здароўе цёткі Хрысціны і яе сына. Лётчык ляціць далей. А праз дзень Грышка зноў спыняецца перад варотамі Хрысціны — смачныя ў яе былі аладкі мінулага разу. І калі тая пытаецца: ад каго-ж можа быць ліст? — Грышка адказвае: «Ад сына напэўна, ад другога сына?» І маленькі паштар зноў пачаў чытаць Хрысціне ліст, але... скончыць не змог і пачаў прасіцца, што больш гэтак рабіць не будзе. Калі Хрысціна зразумела, яна зарагатала на ўсю хату, пагладзіла Грышку па галаве, пачаставала яго мядком і арэхамі.

Назва «Радасць» цалкам апраўдана ў апавяданні. І нават лёгкая самота Хрысціны перад прылётам сына ніяк не памяншае гэтае радасці, а яшчэ больш кантрасна вылучае яе. Калі-б не выпадковыя фігуры, лішнія ў апавяданні, ды доўгія ўспаміны Хрысціны пра мінулае жыццё, апавяданне зрабілася-б больш сціслым і выразным.

У другім яго апавяданні «Дзедаў прынцып» калгасны вартаўнік Мацей, прынцыповы дбайца калгаснага дабра і парадку, узнімаецца на агітсамалёце, які прыляцеў у калгас. Спачатку яму было страшна, потым прыемна, а потым ён закрычаў лётчыку, паказваючы некуды ўніз: «Спускайся». Адшпіліўшы моўчкі папругі, калі самалёт стаў доле, не адказваючы на назойлівыя запытанні дапытлівай моладзі, дзед пашукаў некага ў натоўпе і раптам закрычаў: «Сярожа! Ты тут, сукін сын? Каровы пакінуў? А яны вунь поўгектара грэчкі калгаснай зглумілі. Марш адгэтуль!» Тады толькі ён адказаў на пытанні. «З самалёта мне ўсё відаць было, а не то што...»

У апавяданні «Каменныя валы» (надрукаваным у журнале «Полымя Рэвалюцыі») апавядаецца пра камяні, у якія, паводле народнай легенды, пераўтвораны богам селянін са сваімі валамі і сабакам за тое, што паехаў араць на вялікдзень. Краўчанка апавядае, як калгасныя камсамольцы, не разумеючы, што робяць, сабраліся ўпотай разбурыць пры дапамозе пораху легендарныя валы, таму што яны замінаюць трактарам на полі. Гэта мерапрыемства ім не ўдаецца, бо пра яго даведваюцца праз аднаго з удзельнікаў старшыня калгаса і сакратар райкома камсамола, які прыехаў на веласіпедзе на месца здарэння. Легендарныя валы засталіся некранутымі.

Яшчэ ў адным з апавяданняў, таксама з журнала «Полымя Рэвалюцыі», — «Дружба давяла» апавядаецца пра калгасны спектакль, у якім выведзен на сцэне багамольны дзед Анупрэй. Усе ўпэўнены, што гэта лепшы калгасны артыст — камсамолец Змітрок, і заахвочваюць яго рэплікамі з месца. Але вось спектакль канчаецца. Публіка выклікае Змітрака. Заслона адкрываецца. І ўсё растлумачваецца: ролю, у якой гэтак трапна ўзяты былі рысы набожнага дзеда Анупрэя, выконваў не Змітрок, а сам Анупрэй, які пасябраваў за апошні час з камсамольцамі і ў галаве якога тыя пасеялі «зерне сумнення» ў веру і ў бога. І аўтар канчае: «Вось да чаго давяла дружба багамольнага некалі Анупрэя з камсамольцамі».

Другі празаік — Уладзімір Кандраценя надрукаваў аповесць «Каханне». Чарнавокая маладая Марына, дачка калгаснага пастуха Арцёма, любіць рахункавода Алеся. Але бацька думае аддаць яе за добрага гаспадарнага чалавека, каб толькі, вось, грошы. Рахункавод Алесь вязе ў банк грошы і губляе іх у дарозе. Грошы знаходзіць Арцём і ўтойвае. Але яго мучыць сумленне, тым больш, што дачка рашуча заяўляе, што выходзіць замуж за Алеся. Тымчасам Арцёма выклікаюць у сельсовет, куды прыехаў нехта з раёна. Барацьба ўнутраных супярэчнасцей узмацняецца. Арцём дрыжыць, думаючы пра тое, што ў сельсовеце яго чакае допыт, што ўсе ведаюць пра ўтоеныя ім калгасныя грошы. Але нічога такога няма: проста яго запрашаюць, як аднаго з лепшых калгаснікаў, зняцца ў групе (прыехаў фатограф з рэдакцыі газеты). Ён лёгка ўздыхае. Унутраная барацьба канчаецца тым, што Арцём з намерам аддаць грошы ідзе на пашу, дзе схаваў у кустах партфель з грашыма. Але партфеля там няма. Арцём вяртаецца і словы пакаяннага прызнання зрываюцца ў яго перад дачкою пра грошы. Але дачка, чуючы адрывістыя словы пра згубленыя грошы, не разумее, у чым справа, супакойвае яго, кажучы, што грошы знойдзены (знайшоў іх Саўка, другі пастух калгаса). Аповесць канчаецца тым, як, чакаючы вяселля Алеся з Марынаю, Арцём пытаецца ў Саўкі, ці не ён гэта дапамог яму выблытацца з бяды, на што Саўка адказвае хітрою ўсмешкаю.

— На самым пачэсным месцы пасаджу цябе на вяселлі, — кажа яму на гэта Арцём.

Было ціха, ціха... Павольна віднела на ўсходзе...

«Добра як!» — падумаў Арцём.

Аўтар паставіў перад сабою мэту паказаць, якім шляхам праходзіць фарміраванне свядомасці чалавека. З гэтай задачай ён у асноўным справіўся. Праўда, аповесць Кандрацені, як і апавяданні Краўчанкі, маюць багата недахопаў, да якіх трэба аднесці моўныя выкрунтасы, шматслоўе і квяцістасць, якія па сведчанню Жака Брусона вялікі майстар слова А. Франс называў кандытарскімі цацкамі і прапанаваў бязлітасна выганяць з мастацкага твора.

У Краўчанкі ёсць і вельмі няўдалыя апавяданні — гэта «Прыкрае здарэнне» і «Косая сцежка».

Абодвух празаікаў выгодна адрознівае новая сучасная тэматыка. Яны любоўна ставяцца да чалавека і лёгкі жывы гумар уласцівы ім, калі адзначаюць яны слабасці чалавека. Гумар гэты не злосны і выклікае ў чытача прыязнае пачуццё да чалавека.

Яны абодва не вызначыліся як мастакі, яны яшчэ ў пошуках, у пераймanні ў класікаў ці сучасных арыгінальных мастакоў слова. Самабытнага свайго яны яшчэ пакуль не стварылі.

Не досыць жорстка падыходзяць яны да адбору слоў, не досыць сур'ёзна займаюцца вывучэннем жывой народнай мовы. Багацце і выразнасць фарбаў нашага жыцця засціць перад імі блеск, прыгожасць і гучанне слова, іх слых яшчэ не навучыўся адрозніваць шурпатасці і дысанансы, а вока — адрозніваць брудныя плямы. Яны яшчэ слаба ўмеюць будаваць твор, што выразна відаць на аповесці «Каханне», якая складаецца з паасобных, адарваных адзін ад аднаго эпізодаў.

Тады, калі яны навучацца бачыць гэтыя недахопы, з іх вырастуць сапраўды арыгінальныя мастакі. Пакульжа што гэта радуючыя вока вясновыя парасткі. Іх адрознівае раднаснае ўспрыйманне абкружаючай рэчаіснасці, любоў да чалавека. З адкрытай душой і вялікім пачуццём ідуць яны насустрач нашаму шматграннаму квітнеючаму жыццю.

Р. МУРАШКА.

НОВЫ ТЭАТР У МАГІЛЕВЕ

Па рашэнню ЦК ВКП(б) і СНК СССР у Магілеве ў 1939—40 гг. павінен быць пабудаваны тэатр на 1200 месц. У складанні праекта спаборнічаюць лепшыя беларускія архітэктары і «Тэакінопраект» (праектная арганізацыя Камітэта па справах мастацтваў пры СНК СССР).

Пляцоўка для тэатра адведзена ў самым цэнтры горада Магілева. Адзіны недахоп гэтага ўчастка ў тым, што ён густа населены, і каб ачысціць яго для пабудовы, прыдзецца знесці дзевяць домаўладанняў. Гэта будзе каштаваць каля двух мільёнаў рублёў. Улічваючы, што на будаўніцтва тэатра асігнавана 6 мільёнаў рублёў, трэба адно з двух: або каб Магілёўскі горсовет прыняў знос домаўладанняў на свой кошт, або прадаставіў-бы для тэатра менш населены ўчастак.

Нам. адказнага рэдактара
А. Р. ВАРАШЫЛАЎ.

Друкарня «Звязды». Газета «Літаратура і мастацтва» выходзіць адзін раз у пяцідзённу. Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Савецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Уп. Галоўлітбела № Е—5797.